№№17–18
(2745–2746)

7 лютага 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

ДЫПКУР'ЕР

У Мінск прыбыў новы кіраўнік офіса АБСЕ Ханс-Йохан Шмідт

Новы кіраўнік офіса АБСЕ плануе пазнаёміцца са сваімі новымі калегамі, азнаёміцца з сітуацыяй у Беларусі і праграмамі, якія рэалізуе прадстаўніцтва арганізацыі. Затым дыпламат вылеціць для кансультацый у Капенгаген у штаб-кватэру Парламенцкай асамблеі АБСЕ.

Да ведама. Ханс-Йохан Шмідт пачаў дыпламатычную кар'еру ў 1979 годзе. Працаваў у Егіпце, Конга і ЗША. У 1992 годзе атрымаў пасаду намесніка падраздзялення аддзела еўрапейскіх адносін у МЗС Германіі. З 1996-га па 1998 год працаваў намеснікам генеральнага консула, з 1998-га па 2000 год — генеральным консулам пасольства Германіі ў Санкт-Пецярбургу. У 2000 годзе быў прызначаны на пасаду намесніка кіраўніка Пасольства Германіі ва Украіне. Да прызначэння ў Мінск узначальваў аддзяленне культурных сувязяў у МЗС Германіі. Валодае англійскай, французскай і рускай мовамі.

ВОЛЯ!!!

Артур Фінькевіч вызвалены

У Магілёўскім абласным судзе прайшло абскарджванне прысуду Артуру Фінькевічу, і нечакана суд вырашыў вызваліць хлопца.

Нагадаем, што 20 снежня суд Кастрычніцкага раёна Магілёва асудзіў Фінькевіча на паўтара года зняволення. Ён быў прызнаны вінаватым у парушэнні арт. 415 КК (ухіленне ад адбыцця пакарання). Яшчэ раней, у маі 2006 г., хлопец быў асуджаны на два гады "хіміі" за палітычныя графіці. На пачатку снежня 2007-га ён павінен быў выйсці на волю, але літаральна за месяц з невялікім да гэтай падзеі аказаўся ў СІЗА.

Падчас разгляду скаргі пракурор запатрабаваў для Артура 6 месяцаў зняволення, але вырашана было абмежавацца трыма месяцамі, якія хлопец ужо правеў у СІЗА. Самога Артура пры разглядзе не было, таму для яго навіна стала прыемным сюрпрызам.

Нагадаем, што апошнім часам з месцаў пазбаўлення волі былі вызвалены і Зміцер Дашкевіч, і Мікалай Аўтуховіч, і Юрый Лявонаў, але за кратамі па-ранейшаму застаюцца "палітычныя" Аляксандр Казулін і Андрэй Клімаў.

О ТОМ, ЧТО ВОЛНУЕТ

Мы живем, под собою не чуя страны

Валерий КОСТКА,
подполковник КГБ (запаса), фермер-пчеловод с 1999 года

Эти слова из стихотворения О.Мандельштама, написанные в 1933 году, я вынес в заглавие статьи потому, что они отражают мое внутреннее восприятие сегодняшних реалий Беларуси.

Я задаю себе вопросы и не могу на них ответить. Скажите, мы — суверенная, независимая страна или нет? В Конституции написано однозначно — да. Но 27 декабря минувшего года в программе "25-й час" кремлевский "соловей" И.Бунин сообщает нам "радостную" новость — в 2008 году В.Путин возглавит союзное государство России и Беларуси. А.Венедиктов по радио "Эхо Москвы" заявил прямо: *"Будет реальное включение Беларуси и* ***подтягивание Беларуси к России****". Дальше — больше: "Будет единый президент, и президентом России—Беларуси будет российский президент — нынешний Путин"*.

Во дела! Я сразу и не понял. Может быть, перетрудился в сельском хозяйстве? А может быть, И.Бунин и А.Венедиктов в юмористы-сатирики к Е.Петросяну записались? Но даже в "Кривом зеркале" их шутки не смешны.

Все очень серьезно. Кремль уже все решил. Но при чем здесь Кремль? **Лично для меня все это звучит оскорбительно.** Оказывается, нас, как песика на поводке, будут **подтягивать**. Надо полагать, для начала и подкормить не забудут, а может быть, и будку подкрасят. Никакого государства нет, а президент уже есть. Никаких выборов не было, а уже известно, что президентом будет Путин. Еще в самой России президентские выборы не прошли, но уже известно, что президентом России будет Д.Медведев. Дух захватывает от российской демократии! Там, оказывается, демократия покруче нашей!

Я думаю, что для всех нас — и власти, и оппозиции, и народа Республики Беларусь — наступил **момент истины**. А суть его в ответе на вопрос самим себе — **уважаем ли мы себя, свой суверенитет и независимость, свой народ, свою культуру, национальные традиции и обычаи, свой язык, свои символы, свои законы и Конституцию**? Если нет, то и никто нас уважать не будет. Тогда и место наше — в собачьей будке у Венедиктова, да еще на поводке. Если уважаем себя, тогда и все нас будут уважать, и Россия в том числе.

В статье 3 Конституции Республики Беларусь записано: **"Единственным источником государственной власти и носителем суверенитета в Республике Беларусь является народ"**. Это базис, с которого надо начинать *"работу над ошибками"*. С 1991 года ошибок наворотили уйму, причем, на мой взгляд, и власть, и оппозиция. Необходимо не только их признать, но еще важнее найти их первопричину. И начинать исправлять. Задача непростая.

Со своей *"колокольни"* простого крестьянина (а именно таковым я вот уже более десяти лет являюсь), не одурманенного идеологическим угаром и групповым психозом той или иной политической силы, хочу высказать свой взгляд на происходящие процессы без всякого злого умысла и желания кого-либо обидеть, тем более оскорбить.

Россия и Беларусь: прошлое, настоящее, будущее

Для начала хочу пояснить. Россия многолика, как любое другое государство. Есть российский народ, есть российская политическая элита, есть российский бизнес, есть российские чиновники, спецслужбы, если хотите — есть просто бандиты и т.д. Все это российское, но каждая составляющая имеет свои интересы и возможности влиять на политику внутри страны и на международной арене.

Главным игроком на международной арене выступают политическая элита и крупный бизнес. Народ здесь ни при чем, поэтому **к российскому народу никаких претензий, добра ему и процветания**. Народ за скобками моих рассуждений, а значит, никакого национализма и русофобии.

Россия была и остается империей по объективному определению. Империй в истории было много. Одни развалились, другие трансформировались в нормальные государства, лишившись своих имперских генов. На данный момент их две: российская и американская. Между ними и ведется сейчас главная борьба за сферы влияния. Государство превращается в империю, когда крупный частный или государственный капитал настолько велик, что его интересы не вмещаются в рамки национальных границ. И тогда вектор интересов устремляется в регионы с дешевыми природными ресурсами, дешевой рабочей силой, транзитными путями или стратегически важным местонахождением. В конфликтные регионы, где повышенный спрос на оружие. В регионы, где производятся наркотики. **У бизнеса нет других целей, кроме одной — прибыли. Национальные интересы чужого государства его мало интересуют.** Продвижением интересов бизнеса и идеологическим прикрытием его истинных целей занимается политическая элита или путем создания марионеточных режимов с использованием спецслужб и дипломатов, или вооруженным путем.

И в том, и в другом случае обеспечивается благоприятный режим для крупного бизнеса с целью извлечения той самой прибыли. Крупный бизнес, соответственно, заботится о политической элите, обеспечивая ей власть и, скажем мягко, хороший жизненный уровень. Своего рода сообщающиеся сосуды. Тело одно, а головы две. Те бизнесмены, которые не желают кормить политическую элиту, попадают в тюрьму или убегают за границу. Те политики, которые не обещают служить крупному капиталу, не попадают в политическую элиту, или вообще их убирают.

К нашему сожалению, Беларусь, а в то время Великое княжество Литовское, попала в сферу интересов Российской империи давным-давно. И историки знают, как по указу Екатерины II наше государство в одно время просто ликвидировалось. Никаких *ліцьвінаў*, никакого языка, никакого государства. Просто Северо-Западный край Российской империи с задачей полной ассимиляции населения и полного контроля над территорией.

Политический кризис начала XX столетия и Октябрьский переворот в России позволили нашему народу самоопределиться в формате республики в составе новой, советской империи. В конце 1980-х годов на Советский Союз, увязший в войне в Афганистане, обрушился мощнейший экономический кризис. Мировые цены на нефть упали по сравнению с нынешними ценами в 10 раз, и нефтедобыча для СССР стала нерентабельной. Экономика, которая держалась на распродаже природных ресурсов, рухнула, золотовалютный запас за пару лет проели, и обеспечивать свои геополитические интересы было нечем. Поэтому распустили Варшавский договор, разбежались страны Восточной Европы, бросили Кубу и т.д. Более того, денег не хватало, чтобы обеспечить сам СССР, и он умер. А Ельцин, Шушкевич и Кравчук только констатировали смерть, подписав *"акт вскрытия"*. Беларусь стала суверенной и независимой.

Указ Екатерины II продолжает действовать на генном уровне политической элиты России. Политическое руководство не воспринимает и не желает воспринимать нас как суверенное и независимое государство. И никогда не оставляла без внимания политические процессы в Беларуси, более того, управляла этими процессами через свои тайные *"приводные ремни и механизмы"* и экономические рычаги давления.

На мой взгляд, существует ряд косвенных этому доказательств уже в новейшей истории. Во-первых: сама идея введения поста президента, причем президента, избираемого всенародно, для Республики Беларусь была надуманной. У нас не было в истории национальной традиции такой формы правления. Были все больше коллегиальные формы — сойм, талака и т.д. Вся проблема, с моей точки зрения, в том, что с президентом как главой государства договориться и управлять им легче, чем с целым парламентом. Оппозиция во главе с З.Позьняком понимала эту опасность очень хорошо, поэтому отчаянно сопротивлялась. И не прошла бы эта идея при тайном голосовании, если бы не оригинальное открытие юриста В.Гончара, — провести **тайное голосование поименными бюллетенями**. Знал бы он, чем все эти игры заканчиваются, был бы сам жив и страна совсем по-другому развивалась бы.

(Продолжение на 2-й стр.)

АФІЦЫЙНА

Саўмін вызначыўся

Адпачынак працягласцю больш за 24 працоўныя дні захаваны для моладзі да 18 гадоў, работнікаў аварыйна-ратавальных служб, інвалідаў і тых, хто працуе на тэрыторыях, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Такое рашэнне ўтрымліваецца ў пастанове Савета міністраў Беларусі.

Таксама, згодна з дакументам, адпачынак у памеры 56 дзён захаваны настаўнікам і педагогам агульнаадукацыйных устаноў, ПТВ, ССНУ і ВНУ, санаторных дашкольных устаноў, дапаможных школ (школ-інтэрнатаў), цэнтраў карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі і іншых адукацыйных устаноў.

Астатнім катэгорыям — кіраўнікам, выхавацелям, метадыстам, музычным работнікам і кіраўнікам фізічнага выхавання ў дашкольных установах — будзе прадастаўлены адпачынак у памеры 30 каляндарных дзён. Такі ж адпачынак належыць загадчыкам вучэбна-метадычных кабінетаў, вучэбных лабараторый, выхавацелям, кіраўнікам гурткоў (клубаў па інтарэсах, калектываў аматарскіх аб'яднанняў, секцый, студый і інш.), канцэртмайстрам, акампаніятарам і метадыстам.

Таццяна ДАРАШЧОНАК.

ПАЛІТЫКА

За свабодныя выбары!

Кампанія, якую пачынае ствараемы рух "За свабоду!", мае на мэце спрыяць правядзенню свабодных і справядлівых выбараў у Парламент у адпаведнасці з беларускім заканадаўствам і прынятымі ў дэмакратычных краінах нормамі.

За асноўныя правы

У артыкуле 25 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, які ратыфікавала Беларусь, замацаваны права кожнага грамадзяніна "без усялякай дыскрымінацыі і без неабгрунтаваных абмежаванняў галасаваць і быць абраным на сапраўдных перыядычных выбарах, якія праводзяцца на грунце ўсеагульнага і роўнага выбарчага права пры таемным галасаванні і якія забяспечваюць свабоднае валевыяўленне выбаршчыкаў".

І хоць кожнае з правоў Пакта ў той ці іншай ступені спрыяе стварэнню ўмоў для правядзення празрыстых выбараў, сярод іх ёсць найважнейшыя, без выканання якіх выбары не могуць быць прызнаны свабоднымі і дэмакратычнымі. Гэта права на свабоду думкі (меркаванняў), свабоду слова, свабоду распаўсюджвання інфармацыі, свабоду сходаў і асацыяцый, права на незалежную судовую працэдуру і права на абарону ад дыскрымінацыі.

Менавіта парушэнне гэтых правоў дае дзяржаўным структурам магчымасць фальсіфікаваць выбары. Таму Рух будзе надаваць іх выкананню пільную ўвагу напярэдадні і падчас выбарчай кампаніі ў парламент. Урад не мусіць і надалей грэбаваць асноўнымі правамі, замацаванымі міжнароднымі актамі і Канстытуцыяй Беларусі.

За роўныя магчымасці

Па словах намесніка кіраўніка аргкамітэта па стварэнні Руху Юрася Губарэвіча, дэмакратычнасць выбараў будзе вызначацца па трох асноўных крытэрыях:

— магчымасці палітычных партый і кандыдатаў дэлегаваць і мець гарантаванае месца для сваіх прадстаўнікоў у выбарчых камісіях усіх узроўняў;

— роўныя для ўсіх магчымасці вылучэння кандыдатам і вядзення паўнавартаснай перадвыбарнай кампаніі;

— магчымасці для назіральнікаў бесперашкодна адсочваць выбарчыя працэдуры.

Дадзеныя крытэрыі вызначаліся на падставе нядаўна праведзенага сацыялагічнага даследавання. Паводле яго, беларусы дзеля прызнання выбараў свабоднымі і дэмакратычнымі выказаліся за мажлівасць назіральнікаў бачыць у бюлетэнях пазнакі, зробленыя грамадзянамі, а таксама мець права на перападлік запоўненых бюлетэняў.

На бліжэйшы час запланавана правядзенне "круглага стала" з мэтай распрацоўкі змен у выбарчае заканадаўства і практыкі прымянення існуючых норм закону. Вынікі "круглага стала" будуць выкарыстаны пры планаванні кампаніі па зборы подпісаў з патрабаваннем да дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў унесці адпаведныя змены ў Выбарчы кодэкс і іншыя нарматыўныя акты.

— Калі ўлада будзе не спрыяць правядзенню свабодных і справядлівых выбараў, а імкнуцца іх сфальсіфікаваць, мы зробім усё магчымае, каб данесці інфармацыю пра парушэнні і няроўныя ўмовы перадвыбарнай кампаніі да насельніцтва Беларусі і міжнароднай грамадскасці. Людзі мусяць ведаць праўду і кардынальна змяніць сваё стаўленне да маніпуляцый. Паводле даследаванняў НІСЭПД, больш за палову беларусаў пакуль лічыць, што істотных парушэнняў падчас выбарчых кампаній не адбываецца і вынікі выбараў адпавядаюць сапраўднаму волевыяўленню грамадзян, — паведаміў Юрась Губарэвіч.

Спіс 110-ці

Рух ужо практычна сфарміраваў спіс 110 кандыдатаў у сябры ўсіх акруговых выбарчых камісій краіны. З іх каля 30 асоб мелі досвед працы дэпутатамі мясцовага і нацыянальнага ўзроўняў. Больш за дзесяць чалавек былі сябрамі выбарчых камісій. Шмат хто з іх мае юрыдычную адукацыю альбо досвед удзелу ў выбарах у якасці кандыдатаў ці назіральнікаў.

Падобная праца вядзецца і ў дачыненні вылучэння сябраў ва ўчасковыя камісіі. Як паведаміў намеснік кіраўніка Руху "За Свабоду", сябра Прэзідыума Палітсавета Аб'яднаных дэмакратычных сіл Віктар Карняенка, Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы дамовіліся дадаць да гэтага спісу сваіх прадстаўнікоў.

— Канчатковы спіс будзе перададзены ў адпаведныя дзяржаўныя органы для ўключэння прапанаваных асоб у склад выбарчых камісій. Калі ўлады адмовяцца прызначыць прапанаваных дэмакратычнымі сіламі кандыдатаў у камісіі на падставе нібыта адсутнасці ў іх адпаведнага досведу працы ці па іншых надуманых прычынах, гэта будзе сведчыць пра нежаданне ўлады праводзіць выбары свабодна і дэмакратычна, — адзначыў Віктар Карняенка.

Нагадаем, што выбары ў Палату прадстаўнікоў хутчэй за ўсё адбудуцца напрыканцы верасня 2008 года.

ВАС ЦІКАВІЦЬ

Дзе ж галасаваць?

Як вядома, прапіска ў Беларусі заменена рэгістрацыяй. А як жа будуць галасаваць тыя, хто сталую прапіску мае ў адным месцы, а часовую рэгістрацыю — у іншым?

Максім Абламовіч, г.Мінск.

Цэнтрвыбаркам Беларусі пакуль не вырашыў, як зрабіць, каб выбаршчык не здолеў прагаласаваць двойчы: па месцы жыхарства і месцы часовай рэгістрацыі. Але за такое парушэнне ў адміністрацыйным кодэксе прадугледжаны штраф да 20 базавых велічынь (сёння гэта каля 700 тысяч рублёў).

Намеснік старшыні ЦВК Мікалай Лазавік лічыць, што галасаваць, верагодна, давядзецца па месцы часовай рэгістрацыі. Але канчатковае рашэнне на гэты конт пакуль не прынята.

Алег СНОЎ.

ТЭНДЭНЦЫЯ

Яшчэ аднаго адлічанага студэнта збіраюцца прызваць у войска

Адлічаны летась з Акадэміі кіравання пры прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Юрась Алейнік атрымаў павестку з ваенкамата. Пераабуцца ў боты хутчэй за ўсё яму прыйдзецца летам.

— Напрыканцы студзеня на адрас бацькоў прыйшла павестка з Маладзечанскага ваенкамата, — расказаў "Народнай волі" Юрась Алейнік. — Мяне запрасілі прайсці медыцынскі агляд. Як законапаслухмяны чалавек, павестку я не праігнараваў. Потым накіравалі на дадатковае абследаванне ў Мінск. У ваенкамаце я паказаў афіцыйную паперу з маскоўскага універсітэта "Вышэйшая школа эканомікі", дзе зараз навучаюся. Дэкан факультэта сусветнай эканомікі і міжнароднай палітыкі Сяргей Караганаў прасіў даць мне адтэрміноўку ад войска на час навучання. Аднак у ваенкамаце сказалі, што гэта не падстава і ў летні прызыў мяне забяруць у армію. Калі так здарыцца, буду, як Зміцер Жалезнічэнка патрабаваць служыць у беларускамоўнай вайсковай частцы.

Гісторыю з адлічэннем Юрася Алейніка з Акадэміі кіравання чытачы нашай газеты, напэўна, памятаюць. Выдатніка вучобы і грамадскага актывіста (Юрась сябра ГА"Таварыства беларускай мовы", удзельнік амаль усіх акцый апазіцыі) адлічылі са звыклай для Беларусі фармулёўкай: "За сістэматычныя парушэнні вучэбнай дысцыпліны і ўнутранага распарадку". Юнак загад рэктара Акадэміі аспрэчваў у судзе. Аднак ні ягоныя доказы, ні сведчанні студэнтаў Акадэміі, якія ў судзе прызнаваліся, што маюць значна больш пропускаў заняткаў, не былі прызнаныя дастатковымі. Суд не задаволіў іск Юрася Алейніка.

Адлічэнне юнака мела шырокі розгалас. Алейніку паступіла некалькі прапаноў з-за мяжы працягваць навучанне. Ён выбраў маскоўскі універсітэт "Вышэйшая школа эканомікі".

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

ОБ АВТОРЕ

Костка Валерий Иванович

Родился в 1956 году в д.Черниковщина Смолевичского района.

После средней школы окончил Военную академию (ныне им.Петра Великого), Высшие курсы военной контрразведки.

Служил в органах КГБ СССР. С 1991 г. — в органах КГБ Республики Беларусь.

В 1993 году уволился из КГБ по собственному желанию и политическим мотивам.

Был управляющим делами Молодечненского горисполкома, помощником зам.председателя Верховного Совета 13-го созыва Г.Д.Карпенко. С конца 1999 года — фермер.

Женат. Имеет дочь, сына.

Народная Воля http://www.nv-online.info
7 ЛЮТАГА 2008 г.

О ТОМ, ЧТО ВОЛНУЕТ

Мы живем, под собою не чуя страны

(Продолжение. Начало на 1-й стр.)

Интересным, на мой взгляд, представляется и дискуссия в тогдашнем Верховном Совете 12-го созыва относительно возраста будущего президента. Изначально предлагалось: самый высокий пост может занимать человек не моложе 40 лет. Однако усиленно проталкивался вариант 35 лет. Если проанализировать потенциальных кандидатов в президенты моложе 40, на тот момент их было двое — Гончар и Лукашенко. Самостоятельно идти на выборы без партийной поддержки ОГП Гончар не мог. Партия делала ставку на Карпенко, которому было уже за сорок и которого любой цензуст устраивал. Но Карпенко всегда ориентировался на национальные интересы и независимость Беларуси. Более того, демократ Чубайс открыто заявил: на Карпенко ставить нельзя, поведет Беларусь на Запад. Новиков и Дубко откровенно были непроходными. Позьняк, Шушкевич и Карпенко — заведомо неприемлемыми. Для российских симпатий круг кандидатов сужался до двух — Кебича и Лукашенко. "Умирающий" политик Кебич нужен был лишь для того, чтобы во второй тур не пропустить Позьняка или Шушкевича. Следует обратить внимание и на странное совпадение. Вопрос о введении поста президента и вопрос о создании депутатской комиссии Верховного Совета по борьбе с коррупцией возникли примерно в одно время. Возможно, это и случайность, но тогда и счастливая случайность для А.Лукашенко, чтобы, пока принимается новая Конституция, раскрутить свое имя для новой должности. Если не ошибаюсь, именно С.Шушкевич предложил депутата А.Лукашенко на должность председателя этой комиссии. Знал бы Шушкевич, чем это для него обернется. И не только для него, для всей страны.

Тем не менее все это уже история. А.Лукашенко стал первым президентом Республики Беларусь. Причем вполне законно. В то время законы это позволяли сделать. Хорошая пиар-кампания до выборов, паратройка пиар-трюков во время выборов типа стрельбы под Лиозно и стюардессы по имени Жанна. Российские СМИ все это подали в правильном свете. Претензий нет. Выборы есть выборы. Народ, которому не до глубокого анализа, проголосовал.

Я не думаю, что тогда российская поддержка стоила А.Лукашенко больших обещаний. На тот период в России не было крупного частного капитала, способного открыть пасть на наши экономические объекты. На тот момент Россия больше нуждалась в моральной поддержке, так как все бывшие республики СССР начали создавать свои независимые национальные государства. Россия это воспринимала болезненно, как предательство. Нужен был пример обратной тенденции. Тенденции сближения с последующим воссозданием нового СССР.

В формат моей версии хорошо вписываются и два совершенно не нужных для белорусского народа референдума 1995-го и 1996 годов. Первый референдум ликвидировал наши национальные символы и дату принятия Декларации о независимости Республики Беларусь. Причем Бел-чырвона-белый флаг и герб Погоня более трех лет были нашими государственными символами, депутаты Лукашенко и Коваленок внесли этот флаг в парламент, взяв его у митингующих на площади Независимости. Первый президент Республики Беларусь А.Лукашенко принимал присягу под Бел-чырвона-белым флагом и гербом Погоня. Никому наши символы не мешали. Точнее, это у нас, в Беларуси, они никому не мешали. Все дело в том, что каждая нация имеет свои символы, идентифицирующие ее от других наций, своего рода код нации. Символы объединяют на подсознательном уровне всех граждан данного государства. Символы не придумываются — это послание Всевышнего. Ни один народ не пытался претендовать на чужие символы. Даже у Литвы, которая входила в Великое княжество Литовское как Жмудь, не было претензий. И это понятно: у литовского народа свой код, свой символ. Скажу больше. Наш Бел-чырвона-белый флаг — это очень дорогой подарок Всевышнего. **Наш флаг — это в христианской вере символ Иисуса Христа, это кровь Иисуса Христа на белой Плащанице.** И не случайно бел-чырвона-белая полоса присутствует на мантиях священнослужителей христианской веры.

Вместо нашего национального символа нам предложили надуманные символы, но подсознательно говорящие: вы — не суверенное государство, вы — часть советской империи. И тем самым наш народ разъединили на сторонников и противников. Кому выгодно разделять и властвовать? Тому, кому нужен Северо-Западный край, а не суверенная и независимая Республика Беларусь.

Второй референдум фактически ликвидировал неугодный Верховный Совет 13-го созыва и само понятие разделения властей, превратив их в технические структуры одной единой и неделимой власти президента. И сделано это не случайно. Никто не должен мешать инкорпорации Беларуси в состав России или созданию единого государства, что, собственно, одно и то же. Этот процесс прилетели контролировать и помогать А.Лукашенко заинтересованные лица — Черномырдин, Строев и Селезнев. В том же году подписывается союзный договор. В том же году, я думаю, не без помощи спецслужб России и Беларуси и под их давлением, удаляется подальше из Беларуси главный идеолог национального возрождения Зенон Позьняк.

Не буду перечислять всех признаков, но все шло к реальному объединению России и Беларуси в единое государство. Но, как мне представляется, при общей цели интересы у каждой стороны были разные. Россия стремилась хоть как-то создать эффект начала нового объединительного процесса вокруг себя и расширения своих владений, а А.Лукашенко видел себя во главе будущего государства. При дряхлеющем Ельцине и хорошей пиар-кампании с "белорусским экономическим чудом", с преобладанием коммунистов в Думе — шанс, безусловно, был.

Ситуация принципиально изменилась после красивой "рокировочки" выдающегося и талантливого, говорю без сарказма, дипломата и разведчика Е.Примакова. Ельцин ушел. Путин пришел. А точнее сказать, пришла целая команда профессиональных разведчиков. Вся риторика про объединение поутихла. Появились лозунги - "За сильную и процветающую Беларусь!". И это понятно. Перспектива А.Лукашенко возглавить так называемый союз, конечно же, угасла навсегда. Но для России цель, поверьте, не изменилась. Крупный бизнес набрал мощь. Немногим более года остается до конца второго срока президентства Путина. А уходить в тень с таких должностей на вторые роли, видимо, не очень хочется. В расцвете сил, со статусом национального лидера — и не быть первым? Вот и с новой силой загорелась идея очередной попытки объединения России и Беларуси в единое государство под конкретный политический интерес, теперь уже Владимира Путина. На памяти встреча президентов, после которой А.Лукашенко заявил (не дословно): нам предлагают войти в состав России федеральным округом. Мы на это никогда не согласимся. Это хорошо, что никогда не согласимся. Но, значит, было такое предложение Путина! После отказа А.Лукашенко на предложения В.Путина возник ряд проблем в торговле с Россией — по молоку, мясу, кондитерским изделиям, сахару. Увеличились цены на газ в два раза. В кредите вроде бы и не отказали, но не дали. Одним словом, дали понять, что есть рычаги давления. После этой экономической "процедуры" — официальный визит В.Путина в Минск. И совсем другие песни. И цены на газ ниже запланированных, и кредит — пожалуйста. Надо — еще один дадим. Что это? Изменение тактики с "кнута" на "пряник" для достижения своих целей? А может, цель достигнута? Но почему по белорусскому телевидению не поют песни — "широка страна моя родная"? Тогда отчего так заливаются кремлевские "соловьи" и даже знают имя первого президента еще не существующего государства?

Давайте не будем темнить. Эта судьбоносная тема не может и не должна быть тайной от народа по очень простой и понятной причине. **Народ — первоисточник власти.** И в России и в Беларуси. По крайней мере, так записано в Конституции.

(Продолжение в следующем номере.)

З рэчамі на выхад

У 2007 годзе за неаплату паслуг ЖКГ у Мінску выселены з кватэр 23 сям'і, паведаміла галоўны бухгалтар ДВА "Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка" Таццяна Жабрун.

У Заводскім і Фрунзенскім раёнах выселена па шэсць сем'яў, у Партызанскім і Савецкім — па чатыры, Маскоўскім — дзве, Ленінскім — адна. Як паведамлялася раней, у 2006 годзе было выселена 14 сем'яў. Усяго ў 2007 годзе на высяленне пададзена 137 іскаў. Тэрмін нявыплаты, які заканчваецца высяленнем, як правіла, перавышае шэсць месяцаў, а сумы складаюць ад 2 да 5 млн рублёў.

Папрацавалі над памылкамі

Партыя камуністаў Беларуская аднавіла працу. Пра гэта паведаміў прэс-сакратар партыі Сяргей Вазняк. Нагадаем, 2 жніўня 2007 года Вярхоўны суд поўнасцю задаволіў іск Міністэрства юстыцыі і прыпыніў дзейнасць ПКБ на шэсць месяцаў.

У рашэнні Вярхоўнага суда адзначалася, што з боку ПКБ не былі ўлічаны прадпісанні Мінюста па ўліку арганізацыйных структур і агульнага колькаснага складу партыі. Акрамя таго, пацверджаны ўдзел ПКБ ва ўстаноўчай канферэнцыі Саюза левых партый ва Украіне, што супярэчыць беларускаму заканадаўству.

4 студзеня гэтага года Міністэрства юстыцыі падало ў Вярхоўны суд іск аб ліквідацыі ПКБ. У прэтэнзіях гаворыцца, што пасля прыпынення дзейнасці ПКБ на шэсць месяцаў партыя ажыццяўляла дзеянні, забароненыя ёй заканадаўствам у гэты перыяд.

Абразы не дапамаглі

Супрацоўнікі дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК Беларусі пры вобыску ў кватэры мінскага прадпрымальніка на мінулым тыдні канфіскавалі старадаўнія абразы ацэначным коштам каля 1 млн долараў, паведамілі БелаПАН у прэс-службе Камітэта дзяржаўнага кантролю.

Усяго было канфіскавана больш за 50 абразоў XVII—XVIII стагоддзяў. Цяпер правяраецца законнасць куплі дадзеных каштоўнасцяў.

Вобыск праводзіўся ў сувязі з тым, што ў дачыненні да данага грамадзяніна распачата крымінальная справа за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць у складзе арганізаванай групы (ч.3 арт.233 КК). Ён падазраецца ў тым, што праз падстаўныя фірмы пераводзіў у наяўнасць грашовыя сродкі ў асабліва буйным памеры.

Падазроны арыштаваны.

Дэпутат-апазіцыянер прызнаны лепшым

Дзяржынскі актывіст Аб'яднанай грамадзянскай партыі Уладзімір Лукша па выніках 2007 года прызнаны лепшым народным дэпутатам раёна.

Сам Уладзімір Лукша лічыць, што дзяржаўная ўзнагарода — гэта проста вынік яго штодзённай працы.

— Працую проста адказна. Паўсюль ёсць свае нюансы, я ва ўсе справы ўнікаю, стараюся разабрацца. Вось ацяплення ў горадзе не было — прыйшлося пабегаць, патэрарызаваць ЖКГ.

Нагадаем, што Уладзімір Лукша — адзін з тых трох кандыдатаў у дэпутаты мясцовых саветаў ад аб'яднанай апазіцыі, якім у студзені мінулага года ў гэтыя саветы патрапіць усё ж удалося.

ШЧЫРАЯ ГУТАРКА

Зміцер ДАШКЕВІЧ:

«У турме я навучыўся цаніць нават не дні — хвіліны»

На пазамінулым тыдні з турмы быў вызвалены яшчэ адзін палітзняволены, маладзёжны актывіст Зміцер ДАШКЕВІЧ, які 1 лістапада 2006 года быў асуджаны на паўтара года зняволення па абвінавачванні ў дзейнасці ад імя незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт". Сёння нядаўні палітвязень адказвае на пытанні карэспандэнта "Народнай волі".

— Зміцер, неяк ты прызнаўся, што арышт, судовы працэс і турма не сталі для цябе нечаканасцю. Рыхтаваўся?

— Я ведаў, што мяне пасадзяць яшчэ тады, калі на нас, пяцярых чалавек, была ўзбуджана крымінальная справа. Любы момант мог стаць апошнім днём на волі, а таму рыхтаваў сябе да гэтага маральна яшчэ ад самых прэзідэнцкіх выбараў.

— І бацькоў?

— Канешне, я ім шчыра казаў, што ёсць такая вялікая верагоднасць. І, дзякуючы гэтаму, пасля таго як мяне арыштавалі, яны перажылі сітуацыю больш-менш спакойна. Хоць хваляваліся, натуральна, як яны паіншаму маглі яшчэ ставіцца да ўсяго гэтага? Але тым не менш разумелі неабходнасць той справы, якую я раблю.

— Як вялі сябе следчыя падчас вядзення тваёй справы?

— Цалкам добра. Казалі мне: "Дзіма, ты не хвалюйся. Дадуць табе штраф і пойдзеш дахаты". Так і пайшоў "дахаты" — у турму.

— Ці складана было ў ізалятары?

— Складана, таму што гэта турма... А так я б сказаў, што нічога асаблівага і надзвычайнага не было. А вось у калоніі даводзілася крыху цяжэй, бо там больш магчымасцяў уздзейнічаць на цябе з дапамогай асуджаных, супрацоўнікаў калоніі. Але праз нейкі час таксама ўцягнуўся ў гэты працэс жыцця. Ды і людзі дапамагалі мне.

— Якім чынам?

— Хто — ежай, хто — адзеннем, таму што ў першы час мне былі нават забаронены перадачы. Ды і маральную падтрымку адчуваў. Казалі: "Зміцер, не саромейся, калі што, звяртайся". Я зразумеў там, што грамадства на ўсіх узроўнях адчувае неабходнасць змен, а таму мая пазіцыя была многім блізкая.

— Зміцер, мне многія былыя палітвязні расказвалі, што да іх, як правіла, "прыкамандзіроўвалі" падсадных, так званых "стукачоў". Ты з такімі не сутыкаўся?

— Чаму ж не? Былі і ў нас такія, гэта звычайная практыка. І тут нічога дзіўнага няма. Але ж гэтыя людзі прыходзілі да мяне і шчыра прызнаваліся: "Дзіма, ведаеш, пагражаюць ізалятарам, трэба ім нешта пра цябе сказаць".

— І што раіў?

— Раіў гаварыць усё ў агульных рысах. Калі пыталіся нешта канкрэтнае, то даваў адказ. Не хацелася даваць нейкую інфармацыю чэкістам, але ж не хацелася і падстаўляць людзей, якія былі побач са мной. Бо штрафны ізалятар — гэта не толькі 15 сутак вільготнай камеры, але і крыж на ўмоўна-датэрміновым вызваленні.

— Ці былі ў цябе там аднадумцы?

— Я б сказаў, што ўсе асуджаныя былі маімі аднадумцамі. Бо за 16 месяцаў зняволення я не сустрэў аніводнага чалавека, які б сказаў нешта добрае пра нашу ўладу. Скажу больш: не сустракаў людзей, якія б даказвалі маю няправільную пазіцыю, нават сярод супрацоўнікаў адміністрацыі шклоўскай калоніі. Некаторыя з іх займалі нейтральную пазіцыю, а астатнія ўсё цудоўна разумеюць.

— На якой мове з табой размаўлялі асуджаныя?

— Большасць, безумоўна, па-руску, хоць затым прызвычаіліся і спрабавалі размаўляць на роднай мове. Не хаваю — узнікалі і канфлікты з-за гэтага, але гэта звычайны працэс, калі народ не хоча ўспрымаць нешта новае.

— Вольны час?..

— Вольнага часу там амаль што не было, таму што ўся сістэма ў турме пабудавана так, каб больш трох гадзін свабоды ў суткі ў цябе не было. Астатні час заняты праверкамі, працай, харчаваннем... Вольны час быў толькі ўвечары, і за гэты кароткі адрэзак трэба было ўмудрыцца і нешта пачытаць, і нешта занатаваць, і адказаць на лісты.

— Шмат было кніг?

— Шмат. Чытаў я ў асноўным духоўную літаратуру, якую мне дасылалі сябры, — розных аўтараў, пратэстантаў і каталікоў.

— Амаль усе палітвязні пасля выхаду з-за кратаў на волю расказвалі, што пісалі ў турме мемуары ці нейкія нататкі. Ты не спрабаваў?

— Былі нататкі, але падчас вызвалення ў мяне іх канфіскавалі. Таму зараз буду працаваць над узнаўленнем таго, што забралі, але засталося ў галаве. І, калі Гасподзь дасць часу і моцы, то ў бліжэйшы час, напэўна, нешта такое выдадзім. Зрэшты, я не крыўдую за гэта на адміністрацыю калоніі.

— Пасябравалі?

— Не пасябраваў, але добра ведаў, як моцна іх "накручвалі" чэкісты, якія часта прыязджалі. Наколькі вядома, з КДБ пастаянна званілі, патрабавалі, каб давалі больш справаздач на мяне... Адміністрацыя вымушана была ствараць інтрыгі рознага кшталту. Хаця самі па сабе гэтыя людзі ў размовах ніколі не выказвалі адмоўнага стаўлення да мяне. У мяне склалася такое ўражанне, што яны разумелі абсурднасць усёй сістэмы, у якой мы знаходзімся. І большасць з іх апраўдваліся. Казалі: "Гэта ж наша праца, Дзіма, разумееш?" Пасля чаго выносілі мне папярэджанні за нейкія дробязныя парушэнні. Людзям трэба карміць сям'ю. Не будзеш жа патрабаваць, каб яны скокнулі вышэй галавы. Для мяне самае галоўнае было — бачыць іх унутранае непрыняцце беззаконня ў краіне. А тое, што яны вымушаны былі рабіць, то я ім гэта шчыра дараваў у душы, бо іх галодных дзетак я не накармлю.

— Адным словам, развіталіся нармальна…

— Цалкам нармальна, пажартавалі нават. Казалі мне на развітанне: "Дзімка, ты ж пра нас толькі не забывайся". Нешта накшталт — "прыязджайце да нас на Калыму".

— Зміцер, зараз, праз тыдзень пасля вызвалення, паспрабаваў разабрацца, чаму цябе выпусцілі датэрмінова?

— Я лічу, што на ўсё воля Божая! Але Божая воля, якая не магла б адбыцца без людскога дзеяння. Без салідарнасці маладафронтаўцаў, сяброў розных партый і грамадскіх аб'яднанняў. Вызваленне было немагчыма і без таго вялікага міжнароднага ціску, які ажыццяўлялі ўрады дэмакратычных краін свету. Але, паўтаруся: калі хрысціянін імкнецца ў сваіх дзеяннях і ўчынках прытрымлівацца Божай маралі, то ўсё, што з ім адбываецца, адбываецца па Божай волі. Калі ж чалавек — беззаконнік, то кіруе ім не Гасподзь, а лукавы. Канешне, можна прыкрывацца гучнымі словамі, але канец такіх людзей будзе сведчыць аб іхняй бязбожнай сутнасці.

— Ці змяніўся Зміцер Дашкевіч пасля турэмнай адсідкі?

— За кратамі я прайшоў вялікую жыццёвую школу. Жыццё цяпер успрымаецца як значна больш адказная рэч. На "зоне" я навучыўся цаніць не толькі вольны дзень, а кожную вольную хвіліну, каб як мага больш выцісну́ць з гэтага часу.

— Якія напрадзе планы?

— Пакуль што я яшчэ прыходжу ў сябе пасля таго, як мяне ашарашылі нечаканым вызваленнем. Уваходжу ў курс справы, знаёмлюся з людзьмі. Аказваецца, зараз я ўжо не ведаю больш за палову людзей, якія прыйшлі ў незарэгістраваны "Малады фронт", пакуль я адбываў тэрмін зняволення. У хуткім часе збіраюся праехацца па рэгіёнах, каб сустрэцца з тымі людзьмі, якія дасылалі мне ў турму лісты. Працы напрадзе шмат...

Алесь СІВЫ.

СІТУАЦЫЯ

«Мы касцьмі ляжам...»

Жыхары дамоў, што месцяцца на мінскай вуліцы Карла Маркса, знаходзяцца пад пагрозай высялення. Гарадскія ўлады хочуць выселіць людзей з самага цэнтра на ўскраіну Мінска.

Згодна з архітэктурным планам развіцця беларускай сталіцы, вуліца Карла Маркса павінна стаць цалкам пешаходнай. На думку адказных за рэалізацыю гэтага плана чыноўнікаў, для гэтага неабходна адсяліць жыхароў некаторых дамоў. Праўда, меркаванняў саміх жыхароў спытаць забыліся — людзей папросту паставілі перад фактам.

Згодна з архітэктурным праектам, на месцы дамоў №17 і 19 па вуліцы Валадарскага і на месцы дамоў №9 і 21а па Карла Маркса ўлады хочуць пабудаваць казіно і трохзоркавы гатэль, а таксама аздобіць месца для аўтастаянкі.

Абураныя намерам чыноўнікаў, людзі выйшлі на стыхійны пікет. Сабралося прыкладна чалавек 150—200. У руках жыхары сталіцы, якія апынуліся пад пагрозай высялення, трымалі расцяжкі і плакаты красамоўнага зместу: "Аляксандр Рыгоравіч, абараніце пенсіянераў!", "За пешаходную вуліцу — без рабаўнічага адсялення". А пісьменнік **Уладзімір Арлоў** увогуле апрануў на сябе шыльду з надпісам: "Толькі ў роднай хаце напішу бестселер". *"Высяленне жыхароў нічога агульнага з інтарэсамі людзей не мае,* — лічыць Уладзімір Арлоў. — *На вуліцы Маркса — будынкі, якія прадстаўляюць вялікую архітэктурную каштоўнасць, таму павінны ахоўвацца дзяржавай. А ў нас усё атрымліваецца наадварот".*

Было відавочна, што людзі, якія выйшлі на акцыю пратэсту, настроены даволі рашуча. *"Ніхто нас адсюль не выселіць, мы касцьмі ляжам, але пераязджаць нікуды не будзем",* — абураліся яны. У натоўпе з вуснаў у вусны перадавалася гісторыя аб тым, што нейкі мужчына для таго, каб набыць кватэру ў гэтым раёне сталіцы, вымушаны быў залезці ў вялікія даўгі, а зараз разам з іншымі падпадае пад высяленне. Калі гэта адбудзецца, мужчына нібыта нават пагражае здзейсніць акт самаспалення на адной з цэнтральных плошчаў Мінска.

Усяго пад высяленне падпадаюць жыхары 80 кватэр. Зразумела, людзі, якія ўсё жыццё пражылі ў цэнтры, не хочуць перасяляцца ў "спальныя" раёны. Іх таксама цікавіць і чыста фінансавы бок пытання. *"Усе кватэры прыватызаваныя. Кожны з нас у выпадку пераезду згубіць больш за 100 тысяч долараў,* — гаворыць адзін з жыльцоў Зміцер Марчанка. — *Кошт аднаго квадратнага метра па вуліцы Маркса — 3700 долараў, у той час як у кватэрах мікрараёна "Лошыца", куды нас хочуць адсяліць, квадратны метр жылля каштуе 1700 долараў. Чыноўнікі прапаноўваюць нам кватэры для перасялення, але пра кампенсацыю нічога не гавораць. А па нашых падліках, страты ад невыканання ўказа Лукашэнкі па выдзяленні зямельных участкаў (адсутнасць конкурснага праектавання, аўкцыёнаў на забудову, прыцягнення замежных інвестараў) могуць скласці каля 70 мільёнаў долараў".*

Што да чыноўнікаў, то яны таксама на сустрэчы з жыхарамі прысутнічалі. Праўда, дыялогу амаль не атрымалася. Так, намеснік старшыні райвыканкама Ленінскага раёна **Аляксандр Красуцкі** паведаміў: *"Згодна з распрацоўкай праекта ператварэння вуліцы Карла Маркса пад пешаходную зону будзе закрануты тэрыторыя ад вуліцы Валадарскага да вуліцы Леніна. Праект уключае ў сябе рэканструкцыю тэрыторыі вуліцы Карла Маркса, добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый. Тут не будзе хадзіць транспарт, акрамя таго, для прывабнасці гэтай тэрыторыі, згодна з праектам, вырашана змяніць функцыянальнае прызначэнне саміх дамоў".*

Чыноўнік таксама паведаміў, што праект рэканструкцыі цэнтра Мінска распрацаваны ў "Мінскпраекце": *"На сённяшні дзень эскізны праект рэканструкцыі ўжо распрацаваны. Згодна з ім, пад адсяленне трапляюць жыхары ўсяго чатырох дамоў,* — паведаміў Аляксандр Красуцкі. — *Акрамя таго, праектам прадугледжана будаўніцтва гандлёвага цэнтра па апендыксу, які вядзе да праспекта Незалежнасці. Што тычыцца праекта — ён распрацаваны і прайшоў усе экспертызы. На сённяшні дзень ён накіраваны на ўзгадненне ў Камітэт архітэктуры для зацвярджэння".*

Спадар Красуцкі спрабаваў супакоіць жыхароў тым, што праект толькі распрацаваны і яшчэ не зацверджаны. Але самі жыхары цудоўна разумеюць, што гэта толькі пытанне часу. Людзей справядліва цікавіць іх лёс і працэдура адсялення. "Што будзе з намі? Чаму меркавані жыхароў ніхто не ўлічвае?" — задаваліся пытаннямі яны. *"Адсяленне будзе ажыццяўляцца, згодна з адпаведным рашэннем Мінгарвыканкама. Усе законы Рэспублікі Беларусь у гэтым выпадку будуць выкананы",* — сказаў Красуцкі.

Напрыканцы акцыі пратэсту жыхары дамоў, якія могуць быць пераселены, распачалі збор подпісаў супраць уласнага адсялення. Подпісы збіраюцца накіраваць у Адміністрацыю прэзідэнта і Генеральную пракуратуру з просьбай праверыць законнасць рашэння гарадскіх улад.

Наступны раунд перамоў паміж жыхарамі і чыноўнікамі быў прызначаны на сераду. На жаль, у гэтым нумары "Народная воля" не паспявае паведаміць пра тое, як разгортваюцца падзеі, таму мы абавязкова вернемся да гэтай праблемы ў наступных нумарах.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Пропали две воспитанницы школы-интерната

Разыскиваются две воспитанницы школы-интерната № 9, что на улице Черниговской, 46. Девушки покинули интернат в субботу, 2 февраля, в 20.00 и до сих пор их местонахождение не известно. Одна из пропавших — 13-летняя Арина Лебедева. Ее приметы: волосы черные, средней длины. На ней были надеты: голубая болоньевая куртка, короткая черная юбка, колготки в крупные квадраты и черные замшевые сапоги. Вторая — 14-летняя Виктория Семенкевич. Волосы средней длины, черные. Девушка одета в черные брюки, темные сапоги и светлую дубленку.

Если кому-то известно что-нибудь о местонахождении подростков, просьба позвонить по телефону **229-48-88**.

Вясна ідзе

У садах Беларусі з-за незвычайна цёплага надвор'я пачалі фарміравацца пупышкі на пладовых дрэвах. Пра гэта паведаміла вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута пладаводства НПЦ па бульбаводстве і плодагароднінаводстве Надзея Капічнікава.

Па яе словах, пры невялікім зніжэнні тэмпературы нічога страшнага не адбудзецца — дрэвы, наадварот, пройдуць працэдуру закальвання, а вось калі мароз стане мінус 15—17 градусаў, то дрэвы пацерпяць і потым проста не расквітнеюць.

Дарэчы, у другой палове лютага чакаюцца невялікія маразы (да мінус 8 градусаў), таму ёсць надзея, што нашы дрэвы перажывуць зіму нармальна. А вось адсутнасць снегу (адпаведна і вільгаці) вельмі неспрыяльныя для большасці раслін.

Як адзначаюць спецыялісты, зараз набухаюць таксама пупышкі ў чорнай парэчкі і агрэста. А бружмель дык увогуле расквітнеў па другім крузе. Ранняе набуханне пупышак, а потым зніжэнне тэмпературы неспрыяльныя для ўраджаю, адзначаюць спецыялісты.

Народная Воля http://www.nv-online.info
7 ЛЮТАГА 2008 г.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

Навумаў усё не супакоіцца

Расследаванне крымінальнай справы па факце правядзення несанкцыянаванай акцыі ў Мінску 10 студзеня "ідзе дастаткова паспяхова". Пра гэта ў гутарцы з журналістамі паведаміў міністр унутраных спраў Беларусі Уладзімір Навумаў. Паводле яго слоў, "дзеянням удзельнікаў лёгка даваць ацэнку", паколькі ўсё, што адбывалася, запісана сістэмай відэаназірання.

"Калі вельмі прынцыпова падысці, напэўна, 50 маладых людзей могуць быць прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці. Але, як заўсёды, мы стараемся ў сваёй ацэнцы даваць шанц людзям, каб яны ўсвядомілі, што ўчыненыя імі дезянні супрацьзаконныя", — сказаў У.Навумаў.

Паводле яго слоў, падчас расследавання дадзенай крымінальнай справы будуць улічвацца ўзрост удзельнікаў акцыі і "псіхалогія натоўпу".

Нагадаем, што акцыя пратэсту 10 студзеня была арганізавана індывідуальнымі прадпрымальнікамі (ІП) у знак пратэсту супраць падпункта 1.1 указа прэзідэнта №760, згодна з якім з 1 студзеня 2008 года ІП могуць наймаць работнікаў толькі з ліку блізкіх сваякоў. У акцыі ўзялі ўдзел больш як тры тысячы чалавек. 27 удзельнікаў былі затрыманыя міліцыяй. 22 затрыманыя былі асуджаныя на 15 сутак адміністрацыйнага арышту, адзін — на 20 сутак.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

АФІЦЫЙНА

І не меней!

Урад Беларусі ўстанавіў месячную мінімальную заработную плату ў памеры 208 тысяч 800 рублёў. Пагадзінная МЗП устаноўлена ў памеры 1 тыс. 240 рублёў.

Нагадаем, з 1 студзеня 2007 года мінімальная заработная плата складала 179 тыс. 50 рублёў. Пагадзінная МЗП -- 1 тыс. 60 рублёў.

У адпаведнасці з законам "Аб устанаўленні і парадку павышэння памеру мінімальнай заработнай платы", МЗП (месячная і пагадзінная) прымяняецца як дзяржаўны мінімальны сацыяльны стандарт у сферы аплаты працы за работу ў нармальных умовах пры выкананні ўстаноўленай (месячнай або пагадзіннай) нормы працы.

Памер МЗП (месячнай і пагадзіннай), устаноўлены заканадаўствам, з'яўляецца абавязковым для наймальнікаў у якасці нішэйшай мяжы аплаты працы работнікаў.

Марына НОСАВА.

«Аддам радовішча ў добрыя рукі»

Указам Аляксандра Лукашэнкі зацверджаны пералік радовішчаў, якія прапаноўваюцца для перадачы ў канцэсію.

Паводле інфармацыі прэс-службы беларускага кіраўніка, такімі аб'ектамі вызначаны радовішчы гіпсу "Брынеўскае", жалезных руд "Аколаўскае" і "Навасёлкаўскае", бентанітавых глін "Астражанскае".

"Перадача іх у канцэсію дазволіць прыцягнуць замежныя інвестыцыі, асвоіць радовішчы карысных выкапняў і пабудаваць на іх базе вытворчыя магутнасці, стварыць новыя працоўныя месцы і забяспечыць дадатковыя заказы на вытворчасць машын і абсталявання для айчынных вытворцаў", — гаворыцца ў паведамленні прэс-службы прэзідэнта.

Да ведама. *Канцэсія — дагавор на здачу дзяржавай у эксплуатацыю прыватным прадпрымальнікам альбо іншаземным фірмам прыродных багаццяў.*

Алег СНОЎ.

ЧУЛІ?

Лібералізацыя?

Адмяняць інстытут "залатой акцыі" ў Беларусі пакуль не плануецца, аднак падрыхтаваны праект указа прэзідэнта, які прадугледжвае змяненне крытэрыяў яе ўвядзення. Пра гэта паведаміў старшы саветнік па юрыдычных пытаннях Міжнароднай фінансавай карпарацыі ў Беларусі Валерый Фадзееў.

Паводле яго слоў, у якасці падставы для ўвядзення "залатой акцыі" на прадпрыемстве *"прапаноўваюцца крытэрыі канстытуцыйнага плана (што тычацца бяспекі дзяржавы і грамадзян)"*. Раней падставай для ўвядзення "залатой акцыі" магла стаць, напрыклад, нявыплата зарплаты работнікам прадпрыемства ў поўным аб'ёме на працягу трох месяцаў запар або нездавальняючая структура бухгалтарскага балансу прадпрыемства на працягу шасці месяцаў.

Акрамя таго, зазначыў В.Фадзееў, урад *"спрабуе выключыць норму, якая прадугледжвала, што на прадпрыемстве з "залатой акцыяй" рашэнне дзяржоргана з'яўляецца абавязковым для выканання і прымаецца без абмеркавання"*. У праекце новага ўказа за прадстаўніком дзяржавы прапаноўваецца захаваць толькі права вета на рашэнні, што прымаюцца па асобных пытаннях.

Паводле слоў В.Фадзеева, новы дакумент утрымлівае яшчэ адно абмежаванне: "залатая акцыя" можа быць уведзена, калі доля дзяржавы ў статутных фондах прадпрыемстваў не перавышае 25%. Пры наяўнасці ў дзяржавы блакіруючага пакета (25% і больш) "залатая акцыя" не патрэбна.

Нагадаем, што "залатая акцыя" дазваляе дзяржаве ўмешвацца ў дзейнасць любых акцыянерных таварыстваў. Спецыялісты доўгі час звярталі ўвагу на тое, што такое жаданне дзяржорганаў усё кантраляваць стрымлівае інвестараў. І вось нарэшце афіцыйныя асобы адумаліся?

Ірына САЗАНОВІЧ.

ПРАБЛЕМА

Дзе пяць, там і шэсць?

Міністэрства адукацыі патрабуе прытрымлівацца ў школах, гімназіях і ліцэях пяцідзённага навучальнага тыдня. Пра гэта на выніковай калегіі міністэрства паведаміў міністр адукацыі Беларусі Аляксандр Радзькоў.

Паводле яго слоў, *"адукацыйныя тэхналогіі ў школах павінны спрыяць захаванню здароўя". "Выхадныя дні неабходна выкарыстоўваць для заняткаў спортам, адпачынку, магчыма, для самастойных заняткаў"*, — сказаў міністр. Справа ў тым, што некалькімі днямі раней на рэспубліканскай нарадзе работнікаў сістэмы адукацыі прадстаўнікі Камітэта дзяржкантролю канстатавалі, што ў Мінску *"большасць школ працуюць шэсць дзён у тыдзень"*. І міністэрства ўзялося "наводзіць парадак".

Таццяна ДАРАШЧОНАК.

РОЗДУМ

Лявон БАРШЧЭЎСКІ, старшыня Партыі БНФ

Аб «праекце нацыі»,

або Убоства афіцыйнай ідэалогіі

У Беларусі расце, квітнее і пахне армія "ідэалагічных работнікаў". На іх утрыманне ідуць вялікія бюджэтныя (а відаць, што і пазабюджэтныя) сродкі. Яшчэ нядаўна галоўным заняткам гэтага люду было стварэнне ў грамадскай свядомасці вобраза "адзінага народа". Цяпер у моду пачала ўваходзіць ідэалагема "Мы — нацыя". Трэба разабрацца, у чым палягае прычына такой, здавалася б, малапрыкметнай змены і ці не вядуць нас новыя Сусаніны ў нейкае непраходнае балота.



Звернемся да няўмольных лічбаў. У траўні мінулага года 31,7% дарослага насельніцтва краіны былі згодныя далучыцца да Расіі, "калі наступствы павышэння цэн на расійскія энерганосьбіты будуць цяжкімі". *(Тут і далей прыводзяцца звесткі цэнтра НІСЭПД.)* Сярод тых, хто так лічыў, пераважалі людзі пажылыя і асобы з нізкім адукацыйным узроўнем — тыя, хто быў і ёсць галоўным апірышчам сённяшняй улады.

Што ж на гэты конт меркавалі маладыя і адукаваныя суайчыннікі, сацыялізацыя якіх адбывалася ўжо ў гады незалежнасці Беларусі? Тут свае міфы і забабоны. Далучацца да Расіі ў сваёй бальшыні яны вялікага жадання не маюць, але пры першай магчымасці гатовы выехаць на пастаяннае месца жыхарства ў ЗША або краіны Еўрапейскага Саюза. Доля гэткіх кандыдатаў у эмігранты складае каля 40%; яна досыць стабільная і ад коштаў газу практычна не залежыць.

Як даводзіць сучасная аўтарытэтная палітычная навука, нацыі *ствараюцца некім*. Самі сабою яны не ўзнікаюць, а фарміруюцца на глебе культуры — адметнай, адрознай ад іншых, — а таксама ў працэсе *рэалізацыі пэўных нацыянальных праектаў*. Наконт культуры тутэйшыя ідэолагі даўно зрабілі свой выбар: замяніць нацыянальны, еўрапейскі ў сваёй аснове складнік на сурагат накшталт прадукцыі шмат якіх графаманаў з "генеральскага" Саюза пісьменнікаў Беларусі або дамарослых безгалосых і прымітыўных поп-зорак. На мясцовым тэлебачанні дыктары на расійскай мове расказваюць "о творчестве белорусской поэтессы Констанции Буйло", а ў т.зв. Палаце прадстаўнікоў (якая называе сябе парламентам) дэбаты аб зменах у правапісе сучаснай беларускай мовы вядуць на ўсё той жа кепскай расійскай... Што да нацыянальных праектаў, дык тут гэтыя ідэолагі паводзяць сябе паводле логікі самага зацікаўленага ў самазахаванні дзяржапарату, які разумее: калі не будзе сваёй дзяржавы, дык ён, гэты апарат, проста знікне. Адсюль на вуліцах мноства біг-бордаў са скрадзеным у ранняга Беларускага Народнага Фронту лозунгам "За Беларусь!". Можна толькі здагадвацца, якія сумы грошай падаткаплацельшчыкаў накіроўваюцца на гэткія забавы... А гэта ж толькі відочная частка айсберга.

Але ж чаму тады сацыёлагі ніяк не могуць зафіксаваць станоўчай дынамікі ў рэалізацыі гэткага маштабнага праекта? Каб адказаць на гэтае пытанне, трэба разабрацца з адпаведнай тэрміналогіяй, не блукаць сярод вехаў, усталяваных у XVIII або ў XIX стагоддзях (чым, дарэчы, грашыць не толькі сённяшняя ўлада, а і, скажам, вельмі паважаны мною Зянон Пазьняк). Паводле сучасных уяўленняў, нацыя — гэта грамадства, якое авалодала, паставіла пад свой шматбаковы кантроль дзяржаву. Гэта наогул мажліва толькі тады, калі ў краіне сфарміраваная моцная грамадзянская супольнасць — гэта значыць, грамадства складаецца з *грамадзянаў* (гэта ж аднакарэнныя словы!), а не з *падданых*. Сённяшняя ўлада імкнецца якраз да адваротнага. Цыркуляры сённяшняга Міністэрства адукацыі (напрыклад, наконт таго, як школьнікі могуць выязджаць на экскурсіі за мяжу, або на якіх падставах беларусу можна атрымаць у замежжы вышэйшую адукацыю) — яскравае пацвярджэнне гэтага тэзіса. Міністэрства даўно ўжо ўявіла сабе, што ўсе дзеці дашкольнага і школьнага ўзросту — гэта *яго ўласнасць*, што, як за сталінскім часам, яны існуюць не дзеля таго, каб радаваць (або і засмучаць) сваіх бацькоў, а толькі каб будаваць *"процветающую Беларусь"*. Крыўдна, што бацькі (а ў сваёй бальшыні яны сфарміраваліся як асобы фактычна пасля 1990 года!) часта гэтага проста не разумеюць і ніяк не адстойваюць законныя правы сваіх дзяцей.

Сам факт узнаўлення ўладнай *"вертыкалі"* пасля першых прэзідэнцкіх выбараў 1994 года значыў, што *"новая"* ўлада была новаю толькі — і тое часткова — паводле свайго персанальнага складу. І новаабраны прэзідэнт, і абсалютная бальшыня яго тагачаснай каманды належалі да розных слаёў колішняй савецкай партыйнай або камсамольскай наменклатуры (пачытайце іх біяграфіі ў розных выданнях даведнікаў "Хто ёсць хто ў Беларусі"). Увесь час звязваючы сябе з мінулым і не хаваючы гэтага, улада захавала і сваю савецка-наменклатурную прыроду. Разнастайныя "акадэміі" ці "інстытуты" кіравання — гэта таксама ўсяго толькі старыя партыйныя школы, толькі што ў падноўленым выглядзе. Усё, на што, па сутнасці, сённяшняя ўлада ў Беларусі аказалася здольная, — гэта аднавіць страчаную за гады перабудовы жорсткую цэнтралізацыю, але цяпер ужо ў крыху іншых эканамічных умовах.

Прэтэндуючы на права лічыцца *"интеллектуальной, мозговой частью СССР"* (А.Лукашэнка. Выступ на XIV Саміце краін — членаў Руху недалучэння), новая-старая беларуская ўлада не здолела прааналізаваць прычыны распаду вялікай імперыі і, адпаведна, прапанаваць праграму ўваходжання маладой беларускай дзяржавы ў сучаснасць. Адна добра вядомая асоба выказалася некалі на гэты конт гранічна ясна: *"Я свою страну за цивилизованным миром не поведу"*. Зрэшты, гэта праўда, што сённяшнія ўладары маюць патрэбу ў дзяржаве. Але гэтую дзяржаву яны разглядаюць як сваю прыватную ўласнасць, а пра дэмакратычныя каштоўнасці гатовыя згадваць толькі на паперы. Каб у гэтым пераканацца, дастаткова зазірнуць у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, у артыкуле 3 якой, да прыкладу, гаворыцца: *"Адзінай крыніцай дзяржаўнай улады і носьбітам суверэнітэту ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца народ"*. Зразумела, што ў адпаведнасці з гэтым сцвярджэннем гэты народ у дні выбараў трэба масава грузіць у аўтобусы і везці на ўчасткі — каб ён там *абнавіў выток крыніцы дзяржаўнай улады*. І тут ужо неабавязкова нават лічыць нейкія там галасы, бо ўлада адна — "стабільная" і вечная, і гэта менавіта яе сімвалізуюць пэўныя партрэты, якія можна паўсюдна бачыць на тых самых участках...

Народ павінен быць адзіны (*единая общность* — у тэрміналогіі высокапастаўленага грамадазнаўцы, акадэміка і доктара фізіка-матэматычных навук Анатоля Рубінава). Ці ж магчыма гэтаму пярэчыць? Але дэкларавана на афіцыйным узроўні еднасць — гэта не што іншае, як забарона на існаванне шматстайнасці інтарэсаў у грамадстве, ды і ўвогуле адсутнасць права на самастойнае выяўленне якога-небудзь інтарэсу. Што да практыкі, дык без ужывання грубай сілы, апарату падаўлення сёння падтрымліваць такі тып еднасці ўжо немагчыма.

У свой час на добра вядомай ідэалагічнай нарадзе яе ініцыятар кінуў наступную рэпліку: *"Мы создаем идеологию, которая будет пронизывать все. Я всегда сторонник того, что государству есть дело до всего. Не просто взяли и "замочили". Как Наумов на улице. У него другие функции, другие методы, другая система работы"*. Адразу можна меркаваць, што адзін з улюбёных фільмаў аўтара гэтага выказвання — "Семнаццаць імгненняў вясны" Таццяны Лёзнавай. Памятаеце, як шэф гестапа групенфюрэр Мюлер гаворыць пра метады работы яго ведамства, параўноўваючы іх з метадамі дзейнасці шэфа контрразведкі брыгадэнфюрэра Шэленберга?.. Гледзячы, аднак, па тым, што падначаленыя кіраўніка беларускага хакея міністра Навумава апошнім часам на вуліцах і ў міліцэйскіх пастарунках *"мочаць"* усё больш актыўна, з ідэалогіяй у нас, відаць, робіцца нешта не тое. Нешта не тое адбываецца і ў прасоўванні *"правільнага"* рэцэпта фарміравання нацыі.

Чаму ж так? Адказ вельмі просты. Роля дзяржавы ў фарміраванні нацыі бывае паспяховаю толькі тады, калі яна адмаўляецца ад сваёй манаполіі на дзяржаўнае будаўніцтва і дае магчымасць грамадзянскай супольнасці, у тым ліку інтэлектуальным элітам, браць у гэтым чынны ўдзел. Вось жа, у Беларусі немагчыма прымаць стратэгічныя дзяржаўныя рашэнні, не ўлічваючы думак людзей з досведам акадэміка Радзіма Гарэцкага, прафесара Станіслава Багданкевіча або пісьменніка і дыпламата Генадзя Бураўкіна (спіс гэты можна і трэба доўжыць і доўжыць). Я не кажу тут пра лідэраў апазіцыйных палітычных партый. Для сённяшняй улады яны — ворагі паводле вызначэння (у прапагандысцкім дыскурсе слова *"апазіцыйны"* ўжывацца як сінонім слова *"варожы"*) — а значыць, павінны быць прыніжаныя і абылганыя.

Праца над *"праектам нацыі"* пачынаецца са стварэння механізму ўзаемадзеяння ўнутры грамадства, а таксама — у гэтым канкрэтным пытанні — паміж грамадствам і ўладай. Але гэткага механізму ў Беларусі сёння няма, ды і ў мінулым практычна не было. У краіне існуе завядзёнка глабальнага адчужэння ўлады і грамадства адно ад аднаго. Асабіста я шмат разоў сутыкаўся з такой сітуацыяй, калі дзяржаўныя чыноўнікі з дыпломамі *"вучонага агранома"* проста хаваліся ад мяне, кандыдата навук, звычайнага педагога і літаратара. Але звернемся яшчэ раз да вынікаў сацыялагічных апытанняў. Пры адказах на пытанне "На каго перш за ўсё абапіраецца ўлада?" у тройцы лідэраў апынуцца сілавыя структуры (48,6%), пенсіянеры (41,4%) і прадстаўнікі "вертыкалі" (37%). (Ні тыя, ні другія, ні трэція, дарэчы, ніякім чынам не ўдзельнічаюць ў стварэнні матэрыяльных даброт або інтэлектуальнага прадукту!) Хто ж стаіць напрыканцы гэтага спісу? Няцяжка здагадацца, што гэта — спецыялісты (9,9%), культурная і навуковая эліта (8,3%) і бізнесоўцы (4,5%).

Вядома ж, грамадскую думку не варта разглядаць як праўду ў апошняй інстанцыі, але ў гэтым выпадку яна досыць праўдападобна адлюстроўвае рэальную сітуацыю. Сённяшняя ўлада ўмее "мачыць" і апякаць, а вось яе здольнасць удзельнічаць у стварэнні мадэрнай нацыі выклікае вялікія сумневы.

Тое, што ўлада не здольная ўзаемадзейнічаць з грамадствам, робіцца ўсё больш і больш відавочным. Досыць толькі ўзгадаць пра візіт расійскага прэзідэнта Уладзіміра Пуціна, што адбыўся ў снежні мінулага года. Пра тое, што Вышэйшы дзяржсавет — пустая фармальнасць, было добра вядома нават людзям, далёкім ад любой палітыкі. Але ж у Беларусі права займацца палітыкай спрабуе ўзурпіраваць адна-адзіная асоба. Менавіта яна, з вока на вока, і вырашала са сваім расійскім калегам усе пытанні, што назбіраліся за працяглы час. Ужо дванаццаць гадоў прапаганда ва ўсе рупары грыміць аб *"саюзе з Расіяй"*, а восем гадоў — пра *"саюзную дзяржаву"*, а грамадства да адкрытага і ўсебаковага абмеркавання гэтай геапалітычнай прыдумкі дапушчана так і не было. Падазраю, што ніколі і не будзе, бо месцам такіх абмеркаванняў уладары хочуць мець нейкую лазню ў Раўбічах, ці дзе там яшчэ. А ў лазні, канечне ж, месца малавата...

Вядома, што Уладзімір Пуцін да пачатку сваёй палітычнай кар'еры быў кадравым афіцэрам КДБ, а Аляксандр Лукашэнка ўзначальваў саўгас. Але абодва яны, апынуўшыся на найвышэйшых дзяржаўных пастах, выконваюць кіраўнічыя функцыі выключна ў рэжыме спецаперацый. Натуральна, для гэтага рэжыму патрэбна адпаведнае прапагандысцкае прыкрыццё — напрыклад, шматразовыя і пастаянныя запэўніванні наконт таго, што палітыка была, ёсць і будзе *"адкрытай і сумленнай"*. Леташні год даў шэраг прыкладаў падобнай *"адкрытасці і сумленнасці"* — перадусім у сферы прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці. Якія дывідэнды атрымалі звычайныя беларусы, ад імя якіх дзяржава распараджалася кантрольным пакетам акцый кампаніі мабільнай сувязі "Velcom", напрыклад, ад продажу гэтай самай кампаніі — не вядома нікому...

Кіраванне ў рэжыме спецаперацый — прыватны выпадак захавання мабілізацыйнага падыходу ў арганізацыі сацыяльна-эканамічнага жыцця. Адсюль вынікае прынцыповая немажлівасць двухбаковай камунікацыі паміж уладай і грамадствам. Мабілізацыя ажыццяўляецца праз перадачу каманд з верхніх паверхаў кіраўніцтва на ніжнія, і ніякія размовы або, пагатоў, дыскусіі пры гэтым не дапускаюцца.

Мабілізацыя ў сваю чаргу патрабуе пэўнай ідэалогіі. У Савецкім Саюзе яе выбудоўвалі вакол вобраза ворага. У гэтым плане ад савецкага мінулага засталіся нядрэнныя тэарэтычныя і практычныя напрацоўкі, але ў варунках адкрытай эканомікі іх ужыванне страціла сваю эфектыўнасць. (Тым больш што перашкаджаюць нядаўнія глабальныя вынаходніцтвы кшталту інтэрнета або мабільнай сувязі.) Дык вось, вобраз ворага гістарычна выкарыстоўваўся дзеля апраўдання мілітарызацыі ўсяго жыцця ў краіне: тады рабіўся зразумелым заклік *"тужэй зацягнуць паясы"*. У сучаснай Беларусі падобныя заклікі зразуметыя не будуць, асабліва маладзейшай часткай насельніцтва. Таму ўлада вымушана выбудоўваць сваю легітымнасць, абапіраючыся на ўласцівы вялікай частцы нашых з вамі суайчыннікаў патэрналізм. Але арганізацыя на месцы колішняй савецкай рэспублікі велізарнага *"сабеса"* не мае нічога агульнага з фарміраваннем сучаснай нацыі. Гатоўнасць мала што не трэцяй часткі дарослага жыхарства Беларусі ў выпадку пагаршэння свайго матэрыяльнага становішча памяняць сваё грамадзянства навочна ілюструе гэта.

Мажліва, пытанне фарміравання мадэрнай беларускай нацыі сяму-таму сёння падасца другарадным. Ёсць, маўляў, задачы важнейшыя: напрыклад, як ацалець вялізнай колькасці індывідуальных прадпрымальнікаў. Да таго ж сёння ва ўсе дзверы і вокны грукае глабалізацыя, і на яе выклікі трэба аператыўна шукаць адэкватныя адказы. Усё гэта слушна. Але хто павінен шукаць гэтыя адказы? Ці будзе дзеля гэтага дастаткова зшыхтаванай паводле ранжыру арміі бюракратаў і адзінага на ўсю краіну "рэальнага" палітыка? Ці можна знайсці ў цэлым свеце станоўчыя прыклады такой дастатковасці?

Мы павінны прыняць за аксіёму, што фарміраванне мадэрнай беларускай нацыі — гэта задача не толькі актуальная, але і рэальна выканальная. Пры гэтым трэба памятаць, што нацыя — гэта не дзяржава і не насельніцтва краіны, гэта — супольнасць людзей, аб'яднаная адзінай грамадзянскай ідэнтычнасцю і ўсведамленнем сваёй дамінавальнай ролі "суверэна" ў дачыненні да дзяржавы. Фарміраванне такой нацыі магчыма толькі праз супольныя намаганні грамадзянскай супольнасці, бізнесу і дзяржавы.

Апошнім часам улада ўсё часцей гаворыць пра мадэрнізацыю. Яе мэта зразумелая — яна палягае ў стварэнні канкурэнтаздольнай дзяржавы і канкурэнтаздольнай эканомікі. Увогуле, канкурэнтаздольная дзяржава — гэта дзяржава, выдаткі грамадзян і бізнесу на існаванне якой не вышэйшыя, а якасць паслуг якой не ніжэйшая, чым у дзяржавах-канкурэнтах. Але з гэткай маштабнай задачай мажліва справіцца толькі тады, калі ў якасці суб'екта мадэрнізацыі будзе выступаць нацыя-грамадства. Ужываючы звыклы папулізм альбо за кошт чыста тэхнакратычнага набору мераў тут нічога не зробіш.

Між тым часу ў нас не так ужо і шмат. З кожным годам у актыўных і дзеяздольных беларусаў з'яўляецца ўсё болей і болей мажлівасцяў пакінуць межы роднай і, на жаль, неканкурэнтаздольнай дзяржавы. Уцёкі высокакваліфікаваных кадраў у больш прывабныя свабодныя краіны могуць зрабіцца незваротнымі, і тады праз якія-небудзь 15 або 20 гадоў у краіне застануцца адны "вертыкальшчыкі" ды пенсіянеры, прычым пераважна пенсіянеры сілавых структур.

Не ўсё, аднак, выглядае так безнадзейна. Беларусь мае свае каштоўнасці, якія здольныя аб'яднаць нацыю, калі толькі ўлада і яе тутэйшыя і замежныя дарадцы не будуць гэтаму сама меней перашкаджаць. Першая каштоўнасць, дарэчы, хоць і непасляпоўна, гэтай уладай прызнаецца — наяўнасць сваёй незалежнай беларускай дзяржавы, са сваёй гісторыяй. Але гэтая каштоўнасць пастаянна размываецца самой жа гэтай уладай. Самы просты прыклад звязаны з гісторыяй. Улада ўжо дэ-факта прызнала дзяржаваўтваральную ролю продкаў сучасных беларусаў у станаўленні Вялікага княства Літоўскага: менавіта ў дзяржаўным выдавецтве не так даўно выйшла з друку даволі грунтоўная двухтомная энцыклапедыя "Вялікае княства Літоўскае", якую стваралі гісторыкі рознай ступені залежнасці ад гэтых самых улад. Падазраю, аднак, што гэтае выданне было санкцыянаванае Масквою дзеля таго, каб паставіць пад сумнеў, напрыклад, права літоўцаў на сваю ўласную дзяржаўнасць. Гэтыя мае засцярогі развеяліся б, калі б улада паслядоўна змяніла сваё стаўленне і да стрыжнявой падзеі ў станаўленні сучаснай, ужо "чыста" беларускай, дзяржаўнасці — абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі ў Мінску, у 1918 годзе. Гістарычна важнасць гэтай даты ўжо даўным-даўно даведзена. Досыць пагартаць выдадзеныя С.Шупам "Архівы БНР", толькі першая частка якіх (у двух тамах) складае ў суме больш за 2000 старонак аўтэнтычных дакументаў! Ды і ў школьных падручніках па гісторыі Беларусі, выдадзеных ужо за цяперашняй уладай, гэтая падзея зусім не замоўчваецца. Што ж замінае ўладзе надаць, напрыклад, адзначэнню 90-годдзя БНР агульнанацыянальны характар (няхай пазней такі самы характар будзе нададзены і святкаванню 90-годдзя БССР)? Відаць, гэтаму перашкаджае тое, што значнасці гэтай даты *ніколі не прызнавала Масква*. Можа, і пытанне эканамічнай падтрымкі нашага рэжыму ўвязваецца Крамлём з неабходнасцю фальсіфікацыі праўдзівай беларускай гісторыі ў самой Беларусі?

Другая каштоўнасць, якую, на жаль, недаацэньваюць (або прызнаюць толькі на словах) нават многія нашы палітычныя паплечнікі, — гэта беларуская мова. Дык вось тут тыя, хто дае парады цяперашняй уладзе, добра разлічылі: вяртанне беларускай мове яе нармальных правоў не можа адбыцца без спрыяння ўладных структур. Здавалася б, самае простае для сённяшніх уладатрымальнікаў — зрабіць адчувальныя крокі ў гэтым кірунку. Але ж не! Тэлебачанне па ўсіх каналах актыўна працуе ў тым кірунку, каб беларусы не чулі гэтай самай беларускай мовы, а радыё ў гэтым калі і адстае ад тэлебачання, дык зусім не нашмат. Чыноўнікі розных узроўняў нават не здаюць кваліфікацыйнага іспыту па беларускай мове (няхай бы ён спалучаўся і з адпаведным іспытам па рускай). Ва ўстанове, якая называе сябе беларускім парламентам, законапраекты нават не перакладаюцца на дзяржаўную беларускую мову! Карыстанне чалавекам беларускай мовай у публічным месцы робіцца крытэрыем выбару ахвяр для аблаваў, што разпораз праводзяць усё тыя ж *"хлопцы Навумава"*. У школьных і універсітэцкіх праграмах вывучэння беларускай мовы паводле незразумелых матываў скарачаюцца тэксты тых пісьменнікаў, якія на беларускай мове не толькі *пішуць*, але і ўвесь час *размаўляюць* — а значыць, рэальна фарміруюць культуру і норму гэтай мовы (Рыгор Барадулін, Ніл Гілевіч, Генадзь Бураўкін, Уладзімір Арлоў, Уладзімір Някляеў, Вольга Іпатава, Сяргей Законнікаў і іншыя). І я тут не да канца згодны з тымі, хто кажа, што ўлады не любяць, напрыклад, названых творцаў толькі за іх паслядоўную дэмакратычную пазіцыю, таму выкідаюць іх творы з падручнікаў, а іх саміх не пускаюць да школьнікаў ці студэнтаў. Ведаю (бо раней сам не раз быў побач з імі), што падчас такіх сустрэч творцы ніякай палітычнай агітацыяй не займаюцца. Уладам не хочацца дапускаць іншае: каб сённяшняя моладзь менавіта *"ўжывую"* чула з іх вуснаў не скалечаную і не пакарабачаную беларускую мову, задавала пытанні кшталту: як і дзе можна дасканала ёю авалодаць? Дык чаму такое робіцца? Практычная і паслядоўная дыскрымінацыя ўладамі беларускай мовы, а дакладней, яе рэальных носьбітаў, таксама хутчэй за ўсё зноў-такі адбываецца не без дапамогі крамлёўскіх уплывовых дарадцаў сённяшняй прэзідэнцкай вертыкалі. Нездарма з вуснаў цяперашняга расійскага прэзідэнта некалі ўжо прагучала фраза: "Мы — один народ..." Вядома ж, адзін, калі ў Беларусі беларуская мова будзе канчаткова загнаная ў падполле!

Калі ж мы павядзем гаворку пра іншыя каштоўнасці, неабходныя для фарміравання нацыі-грамадства, дык тут разыходжанні незалежнай грамадзянскай супольнасці з уладай не менш глабальныя. Напрыклад, яшчэ адной абавязковай умовай фарміравання нацыі-грамадства як суб'екта ёсць *дэсакралізацыя* ўлады. Усім сегментам грамадства трэба канчаткова развітацца з наіўнай верай у нейкага свяшчэннага "нацыянальнага лідэра", абранніка лёсу, без якога самі людзі не здольныя актыўна абладжваць сваё жыццё. Я разумею, што брэнд "нацыянальны лідэр" можа і павінен выкарыстоўвацца апазіцыяй падчас кампаніі прэзідэнцкіх выбараў, бо тут існуе крайняя неабходнасць дайсці да людзей з невысокім узроўнем адукацыі і грамадскай актыўнасці. Але будаваць канцэпцыю пабудовы мадэрнай нацыі на наяўнасці нейкага аднаго лідэра — гэта, самае меншае, наіўнасць, а па праўдзе, рух у абсалютна супрацьлеглы бок. Прэзідэнт сённяшняй Літвы Валдас Адамкус не пазіцыянуецца там як непагрэшная асоба, якая можа прынесці шчасце літоўцам: не, гэта — асоба, якая, сярод іншага, сімвалізуе суверэнітэт гэтай дзяржавы, наконт чаго паміж сабою *дамовіліся літоўскія эліты*. Таму падчас Каляднага набажэнства звычайныя людзі могуць проста так сустрэць гэтага чалавека з жонкай у адным з віленскіх касцёлаў, практычна без аховы...

Каштоўнасць для сучаснай нацыі-дзяржавы такіх з'яў, як роўнасць усіх грамадзян перад законам, самаарганізацыя грамадства, прыярытэт эканамічнай ініцыятывы перад эканамічным прымусам, уменне адаптавацца да сучаснай шматмоўнай прасторы, свабода сходаў, аб'яднанняў, мітынгаў і шэсцяў — г.зн. у шырокім сэнсе *свабода выбару* — усё гэта непазбежна вяртае нас на агульнаеўрапейскі шлях развіцця. Толькі ўсведамленне вартасці і дасягненне гэтых каштоўнасцяў можа прывесці да з'яўлення тых культурных традыцый нацыі, якія могуць уплываць у тым ліку і на палітыку ў нашай краіне.

Арганізацыя, якую я рэпрэзентую — Партыя БНФ — паводле сваёй прыроды выпрацавала трывалы імунітэт супраць "бацылы папулізму". І тым не менш не магу стрымацца, каб не закончыць гэты артыкул наступнай прапановай да сацыёлагаў. Добра было б, каб яны правялі апытанне на тэму "Ці падтрымліваеце вы ідэю вяртання льготаў на праезд у гарадскім і прыгарадным транспарце школьнікам, навучэнцам сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, студэнтам ВНУ і пенсіянерам па ўзросце за кошт скасавання структуры сённяшняй ідэалагічнай вертыкалі ў Беларусі?" Зрэшты, адказы абсалютнай бальшыні нашых суайчыннікаў можна прадугадаць без вялікай рызыкі памыліцца...

Народная Воля http://www.nv-online.info
7 ЛЮТАГА 2008 г.

Я учился на учителя, а не на идеолога

Здравствуйте, "Народная воля"!

Хотелось бы немного рассказать о том, что творится сейчас в школах.

После окончания университета я как молодой специалист попал по распределению в деревню учителем математики и информатики. Никогда в жизни я не представлял, что такое может быть. Детей насильно заставляют учить биографию А.Г.Лукашенко, вступать в БРСМ, а кто не хочет — получают двойки по... истории Беларуси (!). Меня самого заставляли проводить с учениками идеологическую работу. На это я ответил, что я учился на учителя, а не на идеолога. Пришлось даже написать заявление в районо.

Эта идеологизация школы просто возмутительна, она не имеет ничего общего ни со знаниями о своей стране, ни со знаниями о своем народе и культуре.

В конце письма мне хотелось бы передать большое спасибо человеку, который привел меня в оппозицию — Геннадию Ивановичу Самойленко.

Юрий ФЕДОСЮК.

Жабинка.

ОТ РЕДАКЦИИ

Что можно сказать по этому письму? Ничего плохого, видимо, нет в том, что учитель найдет возможность рассказать о президенте страны. Как нельзя видеть что-то плохое в том, что ученик знает биографию президента. Вопрос в другом — нужно ли применять в школе насильственные методы? Особенно, когда речь идет об идеологических вещах. Как можно снижать оценки по истории Беларуси, если старшеклассник не желает вступать в БРСМ?

И, конечно, очень важно, чтобы учитель оставался учителем, а не превращался в идеолога. Получив хорошие знания, молодые люди сами определят, в каком направлении им дальше двигаться.

ЕСТЬ ПРОБЛЕМА!

В то время, когда министр образования занимается созданием «Белой Руси»...

В нашей Копысской СШ учатся ребята из соседних деревень Левки и Стайки. Эти дети -- с 5-го по 12-й класс -- питаются бесплатно, а дети поселка Копысь обедают за свой счет, только некоторые из них освобождены от платы за питание. Правда, еще несколько человек с 1 января 2008 года освобождены на 50%, а именно — на 800 рублей в день.

Один из учащихся 7-го класса, семья которого живет в городском поселке, попросил своего классного руководителя не ставить его дежурить в школьную столовую, так как он не может физически там находиться. Ему нужно расставить обеды, а потом — когда сельские дети пообедают, грязную посуду убрать. Но сам он не ест, поскольку семья живет очень бедно, почти впроголодь. Половина детей из таких же бедных семей смотрят тем (таким же бедным), кто обедает, в рот. Разве это этично?

В годовщину выхода директивы №2 от 27 декабря 2006 года "О дебюрократизации общества" я был на приеме у первого заместителя председателя Витебского облисполкома Владимира Германовича Новацкого. Я обратился к нему с этим вопросом и внес предложение: можно не выделять специально деньги из бюджета на питание детей из поселка Копысь. В районе 25 сельских школ, каждый день на занятия не приходят 2—3 человека. И вот из этих денег можно бесплатно кормить и наших 40 детей. Он обещал разобраться, но пока изменений нет. В начале января 2008 года я обратился с этим же вопросом и к помощнику министра образования А.М.Радькова, он тоже обещал помочь. Посмотрим...

Теперь хочу привести цитату из ответа белорусского президента на пресс-конференции

перед российскими журналистами 15 октября 2007 года. *"Мы убрали все льготы от чиновников милиции и прочих и отдали детям,* — рассказывал президент. — *Мы* ***бесплатно*** *детей кормим в школе. ВСЕХ. ... Я тогда сказал чиновникам: вы поймите, наши с вами дети имеют возможность нормально поесть, а ведь там, где зарплата низкая, разве приготовят нормально поесть ребенку? А в школу он придет, съест и суп хороший, и горячее, и салат. Два раза в школах питаются. Это же великое дело. Мы же вкладываем в детей. Ну какие могут быть к президенту претензии, если он это отдал детям? А ведь у каждого есть свой ребенок. Хотите, забирайте у детей..."*

Я делаю вывод, что президент, мягко говоря, ввел журналистов в заблуждение.

Говоря об учебном процессе, хотел бы обратить внимание вот на какой факт.

В нашей школе недоплачивают учителям 20%-ную надбавку к зарплате за то, что они проживают в сельской местности. Считается, что городской поселок — это не деревня. Но скажите, чем отличаются условия жизни наших учителей, от тех, с которыми каждый день сталкиваются жители села. Все учителя живут в своих деревянных домах с удобствами на улице: туалет, дрова, вода. И школа наша тоже без удобств, туалет расположен в 50 метрах от школы, дети и учителя бегают по холоду, слякоти справлять нужду. Вот бы чиновникам из Министерства образования и В.М.Здановичу — председателю комиссии по образованию в Палате представителей рассмотреть этот вопрос. Тогда бы и учителя задерживались в школе, не уходили бы. А так в школе вторую и третью четверти не ведется урок физики. Перед началом учебного года уговорили учительницу-пенсионерку поработать одну четверть, пока не найдут нового педагога. Его так и не нашли, а пенсионерка уволилась по состоянию здоровья. И предмет просто не преподают. Но о том, что учителей не хватает, разве говорит министр образования с высоких трибун? Он занялся организацией "Белой Руси". Пусть бы сначала в доверенной ему отрасли разобрался, а потом уж об общественной жизни думал...

Виктор Иванович НЕЗДЕРОВ, бывший учитель Копысской средней школы Оршанского района.

ЕСЛИ БЫ Я БЫЛ ПРЕЗИДЕНТОМ...

Объявил бы войну пьянству и курению

Будучи президентом, я ввел бы абсолютную монополию государства на производство и реализацию спиртного. Ликвидировал бы самогоноварение. Они, самогонщики, спаивают молодежь в первую очередь.

Создал бы фонд борьбы с этим. За любую бутылку самогона — 10 миллионов рублей штрафа, вся сумма — в этот фонд. И из этого фонда — 80 процентов тому, кто выявит.

Запретил бы лицам до 20 лет курить. Курит подросток — родителям штраф. Небольшой, но постоянный, за каждый случай. Некому платить? На исполнительный лист, вырастет — сам начнет платить.

Тебе 20 лет? И ты хочешь курить? Иди в органы власти, зарегистрируйся, получи свой фонд курева и знай, что каждый работодатель уменьшит твой заработок на 10%.

Сколько хороним мы людей, погибших в авариях на дорогах! Если бы я был президентом, лишал бы прав на 10 лет (с конфискацией автотранспорта) всех, кто сел за руль в нетрезвом состоянии. Повторно пьян — оставайся без прав пожизненно.

Николай ДЕМЕНТЕЙ, житель г.п.Шерешево Пружанского района.

ПАЗІЦЫЯ

...Перш чым будаваць атамную станцыю

Пытанне аб энергарэсурсах востра стаіць у нашай краіне, і ўсім вядома, што ўрад надумаў будаваць атамную электрастанцыю, каб такім чынам вырашыць праблему энергазабеспячэння. Аднак сродкаў на такую будоўлю, як я разумею, няма. Па крайняй меры, пазбаўленне грамадзян Беларусі льгот гаворыць аб недахопе фінансаў. Акрамя гэтага, планы будаўніцтва АЭС за кароткі час наводзяць на думку аб якасці будучай будоўлі. У развітых краінах на гэта ідзе 10—12 , а то і 15 гадоў. Пры "ўдарных" тэмпах існуе верагоднасць паўтарэння чарнобыльскай трагедыі, таму асноўная маса насельніцтва (такі вынік зрабіла з размоў і са сваімі знаёмымі, і з усім выпадковымі суразмоўцамі) супраць падобнай будоўлі. Наш народ панес вялікія страты ад "мірнага" атама. Нельга дапусціць новых ахвяр!

Для вырашэння праблемы энергазабеспячэння неабходна перагледзець выкарыстанне мясцовых крыніц энергіі. Так, на думку некаторых навукоўцаў, запасаў нафты ў Беларусі дастаткова для забеспячэння нашай краіны. Толькі патрэбна пракантраляваць, куды і як "ідуць" карысныя рэсурсы. Так, газ, які атрымліваюць пры здабычы нафты, забруджвае паветра, а не выкарыстоўваецца па прызначэнні. Чаму?

Неабходна нагадаць і аб тым, што наша краіна — адна з багацейшых не толькі на лясныя рэсурсы, але і на водныя запасы. Аднак на прылаўках нашых магазінаў знаходзяцца толькі прывазныя рыбныя прадукты, а пра існаванне рачнога транспарту мы і не чуем. А ён жа лічыцца самым танным транспартным сродкам. Вось вам яшчэ адзін спосаб эканоміі.

Улэўнена, што будаўніцтва гідраэлектрастанцый таксама дапаможа вырашыць праблему энергазабеспячэння і абараніць насельніцтва ад новых "чарнобыльскіх" іспытаў.

Ёсць у Беларусі і вопыт будаўніцтва ветраных электрастанцый, у Еўропе зараз звярнуліся да выкарыстання сонечнай энергіі, нельга забывацца і пра існаванне на Беларусі вялікіх запасаў розных выкапняў. Нам трэба значна больш выкарыстоўваць у якасці крыніц энергіі адходы сельскай, лясной гаспадаркі і прамысловасці. Беларускія рацыяналізатары даўно распрацавалі праекты па выкарыстанні бытавых адходаў у якасці крыніц энергіі. Аднак іх ідэі засталіся на паперы, а горы смецця забруджваюць навакольнае асяроддзе. Такім чынам, існуе шмат шляхоў для вырашэння праблемы энергазабеспячэння ў нашай рэспубліцы, таму, лічу, няма патрэбы ў будоўлі атамнай электрастанцыі.

Ларыса ШУКАЙЛА, старшыня Магілёўскага аддзялення ГА "Беларуская асацыяцыя ахвяр палітычных рэпрэсій".

РЕПЛИКА

Не те ориентиры

Увидел по Белорусскому телевидению репортаж из "Силичей", в котором заместитель главы Администрации президента Наталья Петкевич поведала: "Наличие горнолыжного спорта - это один из признаков развития современного общества".

Хочется пожалеть израильтян, марокканцев, алжирцев, египтян... Им не иметь "развитого общества". У них не бывает снега. Как им, беднягам, развиваться?.. А если серьезно, то не на те признаки ориентируетесь, госпожа Петкевич!

Л. НИКОЛАЕВ.

Минск.

НЕ МАГУ МАЎЧАЦЬ

Хто абароніць ад улады?

Шаноўны рэдактар "Народнай волі"!

Да Вас звяртаецца старажыл вёскі Амбросенкі Шаркоўшчынскага раёна Віцебшчыны, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ветэран працы Пётр Георгіевіч Бабіч. Прашу надрукаваць у Вашай газеце маю скаргу на дзеянні мясцовай міліцыі і на абыякавае стаўленне да беззаконня пракурора нашага раёна Дзмітрыя Статкевіча.

А сутнасць справы такая. 16 кастрычніка 2007 года каля 22 гадзін, у цёмны час сутак, у маю хату, узламаўшы замкнёныя дзверы, уварваліся супрацоўнікі міліцыі, каб учыніць вобыск. Перад тым яны грукалі ў дзверы і казалі, што ім патрэбен мой унук, Аляксандр Бабіч. Мы з жонкай патлумачылі, што ў нас унука няма, што ён знаходзіцца ў свайго бацькі, майго сына. Але няпрошаныя госці настойвалі на вобыску. Тады я, успомніўшы закон, папрасіў, каб яны ўзялі панятых з нашай вёскі, каго мы з жонкай ведаем. Але яны аднекуль прывялі незнаёмых людзей.

Пачуўшы незнаёмыя галасы і сумняваючыся, што тыя, хто называе сябе супрацоўнікамі міліцыі, на самай справе імі не з'яўляюцца, мы вырашылі ў хату нікога не пускаць і зачынілі дзверы. Але гэтыя людзі вышыблі двое дзвярэй і гвалтам уварваліся ў хату, гаворачы, што шукаюць нашага ўнука. Не ўбачыўшы акрамя нас з жонкай нікога, яны паехалі.

Я ведаю, што закон дазваляе міліцыянерам уваходзіць у жыллё грамадзян у любы час, але толькі ў тых выпадках, калі ёсць упэўненасць, што там хаваецца злачынца. Але ж наш унук Аляксандр — не злачынца. А калі ў міліцыі была патрэба яго знайсці, то чаму не шукалі яго там, дзе ён тады быў, бо мы гаварылі, што ён у свайго бацькі, а бацькаў адрас — не сакрэт, майго сына ў Шаркоўшчыне многія ведаюць.

Ламаючы дзверы, людзі ў міліцэйскай форме паўтаралі, што выконваюць загад свайго начальніка і пракурора раёна.

Адразу пасля гэтага здарэння ў мяне адбыўся сардэчны прыступ. Добра яшчэ, што "хуткая дапамога" паспела мяне ўратаваць, а то б памёр...

Я прайшоў вайну, зведаў голад і холад, увачавідкі бачыў смерць, але таго, што перажыў тым вечарам, нікому не пажадаю.

Пасля таго здарэння я напісаў скаргу на дзеянні міліцыянераў пракурору Шаркоўшчынскага раёна Дзмітрыю Статкевічу. Але замест яго адказу атрымаў адпіску начальніка Шаркоўшчынскага райаддзела ўнутраных спраў Уладзіміра Барадуліна, які, не папрасіўшы прабачэння за не самыя лепшыя дзеянні сваіх падначаленых, паведаміў мне, што яны "дзейнічалі правамерна" і што праверка маёй скаргі спынена.

Цікава, як паставіцца да такой пазіцыі Ул.Барадуліна міністр унутраных спраў. Не менш цікава, як ацэніць пракуратура рэспублікі тое, што Д.Статкевіч, не адказаўшы мне, перакінуў маю скаргу начальніку міліцыі. Ён жа гэтым груба парушыў закон Рэспублікі Беларусь "Аб зваротах грамадзян" у рэдакцыі ад 1 лістапада 2004 года. Там у частцы 3 артыкула 9 гаворыцца, што "забараняецца перадаваць скаргі грамадзян у дзяржаўныя органы і іншыя арганізацыі (службовым асобам), дзеянні якіх абскарджваюцца".

Я заяваў з фашыстамі, зведаў цяжкую працу пасля вайны і вось у 86 год сустрэўся з бесчалавечнасцю і беззаконнем прадстаўнікоў улады, якая існуе на бюджэтныя сродкі, зароблены народам. Прадстаўнікі ўлады не паважаюць просты народ... А таму я вырашыў сабраць усе свае граматы і віншаванні, падпісаныя прэзідэнтам А.Лукашэнкам, пакласці ў канверт і адправіць назад, на адрас кіраўніка дзяржавы з маімі тлумачэннямі і аповедам пра тое, як абразілі мяне падначаленыя прэзідэнта.

Адначасова мяркую звярнуцца з адпаведнай скаргай у Хельсінкскі камітэт па правах чалавека. Можа, з ягонай дапамогай здолею дабіцца справядлівасці і дамагчыся абароны ад улады, якая здзекваецца з законаў і людзей.

А яшчэ ёсць у мяне кволая надзея на тое, што газета "Народная воля" з маёй скаргай трапіць на вочы генеральнаму пракурору і міністру ўнутраных спраў, і яны зробяць захады, каб іхнія падначаленыя выконвалі дзяржаўныя і чалавечыя законы.

З павагай —

Пётр БАБІЧ, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ветэран працы.

ЭХО

Осторожнее на поворотах!

У меня есть возражение по одному тезису беседы Вячеслава Оргиша с Павлом Шереметом ("Народная воля", 27.12.2007 г.). Шеремет говорит: "Если Лукашенко захочет, он завтра сдаст Беларусь".

Тут я хочу спросить у московского гостя и бывшего нашего соотечественника: а он что, нас, десять миллионов белорусов, уже в грош не ставит? Мы уже ничего не значим? И нас уже можно, как быдло, загнать в любую другую конюшню? Мол, захочет конюх — оставит нас в старой конюшне, захочет — перегонит в новую (кстати, в ту, в которой мы уже прозябали почти 75 лет).

Нет, уважаемый земляк и коллега по журналистскому цеху, это так просто не делается. И не все сегодня в этих отношениях РФ—РБ зависит от одного нашего начальника. Сошлюсь только на одну цифру: сегодня, по сводкам МВД Беларуси, сто тысяч (!) невыездных. Это тех, кто рвется на Запад, а их туда не выпускают. Разве эта огромная армия несогласных с режимом Лукашенко безропотно пойдет по его сигналу в другую сторону? Очень сомневаюсь! Кроме этого, есть еще немало таких людей, кто "битву пад Оршай" отмечает каждый год как национальное событие. И готовы это делать и впредь.

Впрочем, в российско-белорусских отношениях есть нюансы и иного плана, связанные с самим А.Г.

Когда ему перестал светить Кремль из-за известных маневров Путина, его в Россию, как мне кажется, уже и кнутом не загонишь. И не случайно в последнее время он все чаще заявляет о том, что в суверенитете Беларуси он заинтересован не меньше, чем какой-нибудь пропозняковец.

Вот так я понимаю этот тезис, уважаемые коллеги.

Вячеслав ВОЛЬСКИЙ, журналист.

БЕСПРЕДЕЛ

Что это — наглое попрание тайны переписки, мелкое воровство?

Уважаемая редакция!

Шесть лет назад мы с женой взяли на воспитание девочку из Березинской школы-интерната. Зовут ее Кристина, и ей сейчас идет четырнадцатый год.

Благодаря общественным благотворительным фондам "Мир для детей" и "Детям Чернобыля" она выезжала на оздоровление в Италию и Ирландию.

Добрые люди, помогавшие нашим ослабленным детям, не забывают их, пишут письма, звонят по телефону в праздники, а иногда, к Пасхе или Рождеству, посылают маленькие посылочки.

Кристина радуется знакам внимания и ласки, а мы, глядя на нее, радуемся миру, который не без добрых людей.

К глубокому сожалению, наша радость общения омрачается тем, что большинство почтовых отправлений поступает нам в поврежденном виде. Это мягко сказано. Практически ВСЯ корреспонденция из Италии, в том числе заказная, вскрывается неизвестными злоумышленниками.

Из семи писем, отправленных нам из Ирландии, мы получили только три.

Первой была вскрыта посылка весом 3,1 кг из Италии от 24.10.2003 года. В телефонном разговоре с отправителем выяснилось, что в посылку было вложено письмо и в нем пятьдесят евро. Когда мы получили посылку, то денег в ней не оказалось. Всего посылок за пять лет было две. Излишне говорить, что вторую, от 23.12.2005 года, постигла участь первой. Мы попросили наших итальянских друзей посылок больше не отправлять.

Получаемые в дальнейшем все иностранные письма имели следы вскрытия. Мы думаем, что некто поставил нашу корреспонденцию на учет как возможный источник дополнительного дохода. Не стану описывать все случаи повреждения корреспонденции, остановлюсь только на двух последних.

Вскрыто заказное письмо из Италии, датированное 20.12.2007 — 11.12. В письме находились поздравительная открытка и две фотографии. Больше ничего.



В предприятии "Минская почта" на письме проставлен штемпель с датой 12.01.2008. Разрыв дат отправления и получения составляет 23 дня, что не характерно для авиаотправления. К письму приложен документ "Минской почты" о том, что им письмо поступило в поврежденном виде.

В конце декабря Кристине звонили из Италии и сказали, что отправили письмо и в нем в поздравительной открытке находится двадцать пять евро.

Вскрыто заказное письмо из России от 04.01.2008 года. В объемном конверте находилось двадцать семь свадебных фотографий и коротенькое письмо. Денег, конечно, в нем не посылали, но письмо было емким, тяжелым и с ним поступили по отработанной схеме. В "Минской почте" на конверте поставлен штемпель с датой 17.01.2008 и штамп о том, что им письмо якобы поступило в поврежденном виде.

С момента получения первой посылки и до настоящего времени мы не сообщали нашим иностранным отправителям о повреждениях их корреспонденции. Ограничивались разговорами с работниками районного узла связи. Наше терпение кончилось.

По-видимому, закон в особых случаях предусматривает досмотр и изъятие вложений из почтовых отправлений. Однако такое изъятие оформляется соответствующим документом, и как отправитель, так и получатель уведомляются об этом официально. В нашем же случае происходит не досмотр корреспонденции, а наглое попрание тайны переписки и мелкое, низкое воровство.

В то же время думается: а что, если мы не одни такие? Если таких много? Что тогда?!

Не хочется бросать тень на всех работников почты. Они в большинстве своем честные и порядочные люди. Но что же тогда происходит с нашими письмами? Ведь с момента подачи письма и до вручения письма адресату ответственность за его сохранность несет почта.

Невольно вспоминаются заключительные слова одного из рассказов Антуана де Сент-Экзюпери: "Пилот погиб. Почта сохранена".

Почтительно просим вас, уважаемая редакция, напечатать наше письмо в газете. Может быть, найдутся люди, способные пролить свет на эту проблему, или люди, оказавшиеся в такой же ситуации...

С неизменным уважением —

Николай ЕРМАЛОВИЧ, житель г.Березино.

Народная Воля http://www.nv-online.info
7 ЛЮТАГА 2008 г.

События в мире: европейский взгляд

В России повышаются пенсии

Почти 40 миллионов жителей страны получат 12-процентную прибавку к страховой части пенсии, передает НТВ.

По данным ИТАР-ТАСС, в результате повышения средний размер трудовой пенсии увеличится на 222 рубля, пенсии по старости — на 239 рублей, или почти на 10 долларов.

В столичной мэрии уточнили, что минимальная пенсия в Москве с 1 февраля 2008 года составит 5,3 тысячи рублей, более 220 долларов.

Это первое из запланированных в этом году повышений пенсий и зарплат. На заседании Генсовета Федерации независимых профсоюзов России первый вице-премьер Дмитрий Медведев сообщил, что уже в ближайшие годы планируется увеличить пенсии в 2 раза.

В Европе введена единая платежная система SEPA

Таким образом, 27 государств — членов Евросоюза, а также Норвегия, Исландия, Лихтенштейн и Швейцария теперь составляют единое европейское платежное пространство с населением в 330 миллионов человек.

Теперь физические и юридические лица имеют возможность осуществлять переводы средств, используя SEPA, которая положит конец разделению европейского платежного рынка национальными границами. Также появилась возможность производить и получать платежи внутри Европы, используя любой счет в европейском банке.

Важность события многие эксперты сравнивают с введением в 2002 г. единой европейской валюты — евро. И если в отличие от тех событий вступление в новую эру платежного обращения происходит почти незаметно для широкой общественности, для многих банков оно является крайне важным, ведь речь идет о гигантском платежном рынке. Ежегодно в странах Евросоюза производится 74 млрд безналичных платежей — более одной трети мирового объема.

Как отмечают в Евросоюзе, цель проекта SEPA заключается в усилении внутреннего рынка Европы, в рамках которого введена единая инфраструктура и требования к услугам расчетов. Введение SEPA обеспечит как предпринимателям, так и физическим лицам, независимо от их местонахождения, производить расчеты в евро в пределах государства или за границу в соответствии с едиными условиями, правами и обязанностями.

Почему Медведев отказался от теледебатов?

Кандидат в президенты России Дмитрий Медведев объявил об отказе от "участия в совместных агитационных мероприятиях, проводимых на каналах общероссийских и региональных государственных организаций телерадиовещания" — попросту говоря, в предвыборных теледебатах.

Этой теме Би—Би—Си посвятила обширный комментарий. Ниже приводим фрагменты из него.



Официальная версия такова: "Поездки по регионам и рабочие совещания" не позволят Дмитрию Медведеву принять участие в теледебатах. Фото AP.

Таким образом, продолжилась российская политическая традиция — Борис Ельцин и Владимир Путин в дискуссию с соперниками ни разу не вступали. Партия "Единая Россия" также отказалась от дебатов накануне выборов в Госдуму в 2003-м и 2007 годах.

Эксперты в области социальной психологии давно указывают, что российский электорат превыше всех других качеств уважает силу. Отказываясь от дебатов, кандидат как раз и демонстрирует абсолютную уверенность в победе и пренебрежение к соперникам.

"Медведев осознает, что он доминирует в избирательной кампании, поэтому участие в дебатах для него означало бы поддержать других кандидатов", — заявил "Интерфаксу" генеральный директор Агентства политических и экономических коммуникаций Дмитрий Орлов.

"Я понимаю Дмитрия Анатольевича, почему он отказался от дебатов — потому что дебатировать с Жириновским и Зюгановым, извините, просто не о чем", — заявил лидер партии "Гражданская сила" Михаил Барщевский.

По мнению независимого эксперта Станислава Белковского, советники Медведева правильно оценили его сильные и слабые стороны. "Медведев слабо выглядел бы на фоне других. Он довольно слабый оратор, бюрократ, не является публичным политиком, даже Богданов как оратор выглядит намного лучше его. Участие в теледебатах может выявить слабость Медведева, а нет ничего хуже для претендента на высший пост в государстве, чем продемонстрировать русскому народу свою слабость и неспособность к открытой публичной полемике", — заявил Белковский.

Кандидат от КПРФ Геннадий Зюганов расценил отказ Медведева от дискуссии перед всей страной как отсутствие уверенности в своей правоте. По его мнению, это скажется на легитимности президентских выборов в глазах мирового сообщества. Как известно, Зюганов ранее обратился к Медведеву с личным посланием, в котором призвал его провести дебаты, но ответа не получил.

По мнению Евгения Минченко, директора Международного института политической экспертизы, Кремль сознательно стремится сделать президентскую кампанию "незаметной" и был бы не прочь, чтобы от дебатов отказались все кандидаты. Кстати, по мнению некоторых экспертов, отказ в регистрации Михаила Касьянова связан прежде всего с желанием Кремля не допустить его участия в теледебатах, которые, как известно, проходят "вживую".

Зюганов заявил, что Касьянов слишком много знает про внутреннюю жизнь Кремля и в прямом эфире мог бы сказать лишнее.

Первый, он же последний, президент СССР Михаил Горбачев выразил озабоченность состоянием российской демократии. Патриарх российской политики, в последние годы неизменно поддерживавший действия Владимира Путина, в этот раз был необычно резок в оценках.

"С нашими выборами не все в порядке, и наша избирательная система нуждается в серьезной корректировке, — заявил он в в беседе с корреспондентом "Интерфакса". — Здесь речь идет и об организации президентских выборов, и о выборах в Госдуму. Считаю, что нужно поставить вопрос и о возвращении к выборам губернаторов, чтобы люди могли активнее участвовать в общественной и политической жизни".

ЦИТАТА

Нет выборов, есть шоу-оформление «выбора»

Российский Центризбирком завершил регистрацию кандидатов на пост президента страны. Таким образом президентская кампания в России вступила в завершающую стадию. Русская служба "Голоса Америки" попросила прокомментировать предстоящее голосование президента Фонда "Индем" ("Информатика для демократии") Георгия Сатарова. Вот что он сказал:

— Никакой интриги в этих выборах нет, хотя бы потому, что нет выборов. Они уже состоялись. Единственный избиратель в стране выбрал себе президента. Дальше просто мы видим шоу-оформление этого "выбора". Поэтому основная интрига, которая нас ждет, начнется после оформления этого шоу — подписание финального протокола, инаугурации и т.п.

Создают систему предупреждения

Лидеры четырех крупнейших стран ЕС призвали крупные банки к тесному сотрудничеству с государством для предупреждения финансовых кризисов. Об этом сообщает "Немецкая волна".

Германия, Франция, Великобритания и Италия констатировали, что европейская экономика покоится на прочной основе, в то же время необходимо обеспечить большую прозрачность международных финансовых рынков.

По итогам переговоров Гордон Браун, Ангела Меркель, Николя Саркози, Романо Проди и глава Еврокомиссии Жозе Мануэль Баррозу заявили о необходимости реформы экономических, финансовых институтов для отражения будущих шоковых ударов в мировой экономике. Они указали на то, что отныне крупные банки должны более тесно сотрудничать с государством и своевременно и точно раскрывать всю информацию о своих потерях.

Премьер-министр Великобритании Гордон Браун призвал к созданию улучшенной системы предупреждения кризисов мировой экономики. По его словам, "нам нужна улучшенная система оповещения о рисках глобальной экономике". В свою очередь Николя Саркози заявил, что "нужен такой капитализм, который бы содействовал предпринимательству, а не спекуляции".

В своем совместном заявлении участники встречи предупредили, что если финансовые организации не предпримут экстренных мер для решения проблемы, то они не исключают введения новых правил, которые заменят некоторые из механизмов свободного рынка.

Про газ, «свободный от политического давления»

СМИ сообщили, что в Брюсселе на заседании комитета по вопросам иностранных дел Европарламента премьер-министр Украины Юлия Тимошенко предложила ЕС проложить газопровод из Туркмении через Азербайджан, Грузию и Украину. Она объяснила свою инициативу необходимостью уменьшения энергетической зависимости Европы от России.

За последние дни это вторая попытка Киева защитить Старый Свет от "Газпрома". В Брюсселе Юлия Тимошенко, по сути, лишь дополнила то, о чем ранее говорили президенты Украины и Азербайджана Виктор Ющенко и Ильхам Алиев. На встрече в Давосе они затронули вопрос о возможности соединения газотранспортных систем Украины и Азербайджана. Несколько дней спустя эта же тема рассматривалась в Киеве на встрече министра топлива и энергетики Юрия Продана с послом Азербайджана Талятом Мусеиб Алиевым.

Проект, разработанный в 1990-х годах, вписывается в американские схемы сокращения энергетического влияния России на Европу. Проект GUEU в 1990-х называли "проектом будущего", "газом, свободным от политического давления".

В последний раз о строительстве GUEU на высоком официальном уровне говорили летом 2007 года на межгосударственной конференции по энергетике в Тбилиси.

Проект GUEU подразумевает вывод азербайджанского газа к грузинскому приморскому городку Супса. Далее газопровод должен пройти по дну Черного моря до Феодосии и соединиться с газотранзитной системой Украины, а впоследствии и тех стран Европы, которые заинтересованы в получении азербайджанского газа. Особенно заманчиво проект GUEU выглядел в свете будущего присоединения к нему Транскаспийской трубопроводной системы, транспортирующей через Каспийское море центральноазиатские углеводороды в Азербайджан. Об этом, собственно, и говорила Тимошенко в Брюсселе.

«Берлинале»

В Кёльне "пятым временем года" называют карнавал, а в Берлине — проходящий почти одновременно с карнавалом — с 7 по 17 февраля — кинофестиваль "Берлинале".

Впервые в истории кинофестиваль открывается показом документального фильма. Режиссер Мартин Скорсезе привез публике свой фильм о легендарной группе Rolling Stones.

В его основу легли два концерта Rolling Stones, состоявшиеся осенью 2006 года в Нью—Йорке. Выступление легендарных рокеров снимали 16 камер. Общая длина отснятой кинопленки — 150 тысяч метров, говорится в сообщении дирекции кинофестиваля. Кадры концертов перемежаются интервью с членами группы и уникальными архивными кадрами.

Всего в различные программы "Берлинале" включены примерно четыре сотни фильмов, из них 21 поведут состязание за золотого и серебряных "медведей". В конкурсной программе лишь одна немецкая лента — "Вишневый цвет" режиссера Дорис Дерье. Традиционно сильно представлено кино Юго—Восточной Азии и США. Впервые в истории Берлинского кинофестиваля в конкурсную программу включена документальная лента — "Standard Operation Procedure" американца Алена Морриса.

"Это фильм об истории "Абу Грейба", — рассказывает руководитель фестиваля Кослик. — Он показывает нам все то, что мы уже вроде бы много раз видели: и палачей, и жертв. Но правда, сконцентрированная и "ужатая" до размеров фильма, вдруг приводит нас к новым выводам.

Похоже, "Берлинале" верен своему имиджу "самого политического фестиваля мира".

КАЛЕЙДОСКОП

Шоколадная комната

В одном из отелей на Манхэттене появилась "шоколадная комната", стены, мебель и предметы интерьера которой сделаны из бельгийского шоколада, сообщает AP.

В комнате есть шоколадный камин, сделанные из того же материала диваны, столы и книги. Шоколадные стены комнаты украшают "картины", выполненные из разных сортов сладкого деликатеса.

Право стать временным владельцем подобной комнаты компания — производитель бельгийского шоколада разыгрывает в лотерею. Выигрышный купон помещен в одну из коробок с конфетами, выпускаемыми этой фирмой, которую на территории США можно купить до 14 февраля за 23 доллара. В гостиничном номере Bryant Park Hotel на Манхэттене в мае 2008 года победитель лотереи сможет провести романтический уик-энд на двоих.

Сайт для обманутых

В Рунете открылся ресурс "Досвидос.ру", предназначенный для обманутых девушек. Посетительницы ресурса могут отомстить своим бывшим парням, рассказав о них окружающим. Жалобы сервис принимает бесплатно.

На сайте уже опубликовано немало описаний "кобелей", "сволочей" и "кидал". Некоторые из них, судя по явно нарочитым "грамматическим ошибкам", возможно, добавлены в базу данных ради шутки.

В список тех, кому девушки сказали "досвидос", попало несколько известных личностей. Не все из фигурантов сайта — мужчины. "Досвидос.ру" используют также девушки, от которых ушли их подруги.

Камбала-почтальон

Курьезный случай произошел в Японии. Получателем письма, отправленного 15 лет назад школьницей, оказалась… крупная морская камбала.

Послание было направлено первоклассницей в ноябре 1993 года — по случаю 120-летия начальной школы в городе Кавасаки. В тот день красные шарики с прикрепленными к ним записками запустили в воздух и сотни других учеников этой школы.

Шестилетняя Нацуми просила "того, кто получит письмо, обязательно ответить по указанному адресу". Удивление теперь уже 21-летней студентки столичного университета Васэда было безмерным, когда на днях она наконец получила ответ на свое послание.

Письмо прислал 51-летний рыбак Киоси Кимино из прибрежного города Тиоси в соседней префектуре Тиба. Конверт был найден им во время сортировки улова. Хранителем послания оказалась 50-сантиметровая камбала. Оно прилипло к брюху рыбы и, видимо, не один год совершало вместе с ней подводные путешествия.

Камбала-почтальон пошла на продажу, а находка, немало удивившая бывалого владельца небольшой рыболовной шхуны, была незамедлительно доставлена по назначению, передает ИТАР-ТАСС.

Самый длинный тоннель

В США планируют построить самый длинный в мире автомобильный тоннель протяженностью более 25 километров.

Он свяжет два северо-восточных региона Америки и поможет быстро добраться от западной части Лонг-Айленда до Новой Англии, избежав пробок в Нью-Йорке. Об этом сообщает Associated Press.

Новый тоннель получит по три полосы для движения в каждую сторону, а его пропускная способность составит около 80 тысяч автомобилей в день. Стоимость строительства подобного сооружения оценивается в десять миллиардов долларов.

Самый маленький пикап

В интернете появилась первая информация и официальные фотографии нового пикапа Hummer-H3T.

Мировая премьера самого маленького пикапа состоится на мотор-шоу в Чикаго, которое откроется 6 февраля текущего года. Длина погрузочной площадки этого автомобиля — 1,5 метра.

Отгулы в связи с разбитым сердцем

Японская фирма Hime & Company предоставляет своим сотрудницам оплаченные отгулы в связи с разбитым сердцем, сообщает агентство Reuters.

Женщины до 24 лет имеют право на один свободный от работы день в год. Сотрудницы от 25 до 29 могут претендовать на два дня, а тем, кому за 30, Hime & Company готова предоставить три свободных дня.

"Это как заболеть", — пояснила в интервью агентству директор компании Мики Хирадатэ. Она рассказала, что молодым девушкам гораздо легче найти новую любовь, поэтому им полагается всего один день. Для старших женщин расставание с мужчиной — более серьезная травма, поэтому им дается больше времени.

Ранее Hime & Company уже разрешила своим сотрудницам дважды в год в дни распродаж приходить во второй половине дня, потратив утро на шопинг. Мики Хирадатэ пояснила, что так делают многие женщины-служащие, однако в других компаниях они вынуждены придумывать уважительную причину, а, идя на работу, прятать пакеты с покупками в камерах хранения железнодорожных станций.

Я подожду на улице

В итальянском городе Удине на севере страны открылся бутик, в который люди не имеют права зайти без собак, передает корреспондент РИА Новости.

Этот магазин, открытый стилистом Элеонорой Мартин, продает эксклюзивную одежду исключительно для четвероногих.

У входа в бутик помещена большая табличка с надписью "Я подожду на улице", только теперь она относится не к животным, а к их хозяевам. Представители итальянского общества охраны животных с энтузиазмом восприняли эту новость. Они считают, что подобные магазины должны быть открыты во всех городах страны.

Народная Воля http://www.nv-online.info
7 ЛЮТАГА 2008 г.

Галіна Пазьняк

Беларусь у сэрцы

(Працяг.
Пачатак у №№7—8, 9—10.)

МЕНСКІ ГАРСАВЕТ

З восені 1990 года ўсё жыцьцё Рэспублікі, а значыць, і дзейнасьць мясцовых Саветаў, былі зьвязаныя з падзеямі ў Авальнай залі.

Калі я прыйшла ў Менскі гарсавет, аргкамітэт па падрыхтоўцы першай сесіі ўжо працаваў са складу абраных дэпутатаў з першага туру. Была ўжо ўтвораная і Дэмакратычная плынь, у якую ўвайшло чалавек сорак. Фронтаўцаў і "спачуваючых" было, здаецца, сямнаццаць. Астатнія — тыя, хто ня быў з камуністамі, але і да нас яшчэ толькі "прыглядаўся". Былі абраныя тры сустаршыні Плыні, вызначаныя кандыдаты ў старшыні камісіяў, за якіх мы мусілі змагацца на першай сэсіі. Асаблівыя спрэчкі вяліся па кандыдатуры старшыні Менгарсавета ад Дэмакратычнай плыні, бо гэта была першая за 70 гадоў дыктатуры камуністаў магчымасьць выбраць на такую пасаду некамуніста, чалавека дэмакратычных поглядаў.

На маю думку, гэта павінен быў стаць чалавек інтэлігентны, выхаваны, адукаваны, хто з гонарам пройдзе "медныя трубы" Менгарсавета і за каго б было потым ня сорамна. Мне здавалася, што такім чалавекам сярод нас зьяўляецца Ігар Чарняўскі. Са мной пагаджалася многія, кандыдатура была "прахадная" ("рэйтынгавае" галасаваньне Плыні паказала, што Ігара Чарняўскага падтрымлівае большасьць). Здавалася, Ігар возьме на сябе гэты цяжар "першага", але я памылілася. Паразважаўшы, ён адмовіўся.

Тады спыніліся на кандыдатуры Анатоля Гурыновіча. Я ня бачыла ў гэтым чалавеку асобы, якая б адпавядала майму ўяўленьню лідэра. Калі на сесіі абмяркоўвалі ягоную кандыдатуру на пасаду старшыні Гарсавета, камуністы задавалі яму такія пытаньні, адказ на якія патрабаваў канкрэтнай фармулёўкі сваіх поглядаў у адносінах да незалежнасьці Беларусі, адносінаў з Расеяй і інш. "А якое дачыненьне вы маеце да БНФ?" — спытаў нехта. І Анатоль адказаў, што вылучаны ён не ад БНФ, а ад ТБМ (маўляў, ня блытайце). Мне гэта вельмі не спадабалася, бо ў асабістых дачыненьнях з сябрамі Народнага Фронту ён дэкляраваў якраз адваротнае. Я галасавала супраць.

У выніку галасаваньня старшынёй Менгарсавета быў абраны А.М.Герасіменка (бо камуністаў і намэнклятуры, якія выставілі яго кандыдатуру, была большасьць), а А.Гурыновіч — стаў першым ягоным намесьнікам.

Да першай сэсіі ў нас быў падрыхтаваны сьпіс Прэзыдыюма Менгарсавета ад Плыні, за які мы мусілі змагацца далей.

Першая сэсія Менгарсавета паказала: большасьць дэпутатаў у залі складае камуністычны блёк. Але расклад сілаў у нас атрымаўся іншы, чым у Вярхоўным Савеце (дзе Апазыцыя БНФ склала 8 працэнтаў). Фанатычных камуністаў было менш паловы. Да іх прымыкалі кіраўнікі прадпрыемстваў, дырэктары заводаў, школ, бальшыня настаўнікаў. Разам іх была палова ці трохі болей за палову. Але ж дзвюх трацінаў у іх не было, і гэта давала нам магчымасьць блякаваць адыёзныя рашэньні, уплываць на тых, хто спрабаваў самастойна думаць, а ня толькі слухаць загады начальства. Такі шанец давала патаемнае галасаваньне праз бюлетэні, калі дэпутат сапраўды мог галасаваць незалежна ад "пільнага вока". Акрамя таго, у нас зьявіліся шансы заяваць за палову сваіх прадстаўнікоў у Прэзыдыюме. Надзеі і спадзяваньні часам станавіліся радаснай упэўненасьцю, што мы ўжо перамаглі...

Першая сэсія доўжылася, здаецца, тры месяцы. Галасавалі, спрачаліся, стваралі "пагадняльныя" камісіі паміж "імі" і "намі". Нарэшце, дамовіліся: Плынь прадстаўляе на галасаваньне 7 ці 8 чалавек (гэта палова).Такая ж колькасьць будзе і ад камуністаў. Сьпіс Прэзыдыюма будзе зацьверджаны толькі тады, калі пройдуць галасаваньне ўсе "узгодненыя" кандыдатуры ад двух бакоў. Таму галасаваць кожны дэпутат павінен і за "сваіх", і за "іхных".

Гэтая барацьба для многіх з нас была ўпершыню, у чымсьці мы аказаліся даверлівымі і наіўнымі. (Пазьней высьветлілася, што сярод "нашых", якіх прадстаўляла на галасаваньні Дэмплынь, аказаліся і такія, хто потым галасаваў разам з камуністамі...)

Нарэшце (у ліпені 1990 года) абралі Прэзыдыюм. Дэпутаты запісваліся ў дэпутацкія камісіі. Зразумела, дэпутат ня можа займацца ўсім адразу. Я прыглядалася, у якой камісіі праца будзе больш плённая, дзе створыцца дзейсная група дэпутатаў, і хадзіла на паседжаньні чатырох пастаянных камісіяў: па адукацыі, па культуры, на Чарнобыльскую і па прывілеях, але потым вырашыла застацца ў першых дзьвюх.

ВОСТРАЯ НЯСТАЧА ЛІДЭРА

Сілаў было шмат і жаданьня ўсюды пасьпець. Але я разумела, што трэба ствараць і ў Гарсавеце сваю апазыцыю БНФ. Пытаньне: хто яе ўзначаліць? Здавалася натуральным, што гэта павінен стаць Анатоль Гурыновіч: у яго як у першага намесьніка старшыні гарадзкой улады былі вялікія правы, быў свой кабінет, дзе можна было зьбірацца, і галоўнае — інфармацыя па ўсіх галінах гарадзкога жыцьця была перад ім адкрытая. Магчымасьцяў было нямала. Думаю, каб Анатоль узяўся за гэтую неверагодна цяжкую, але ганаровую працу, многае магло б быць іначай.

Калі Гарсавет пад нашым націскам прыняў рашэньне аб усталяваньні нацыянальнай сымволікі над будынкам сталічнай улады, фронтаўцам у Гарсавеце здавалася, што гэта пачатак "вялікіх справаў". Са згоды Анатоля я ўзялася за арганізацыйную частку па фармаваньні фракцыі БНФ і прыхільнікаў (бо большасьці ў нас, зразумела, не было). Адбылося нават некалькі паседжаньняў, але праходзілі яны неяк безініцыятыўна: не было пляна дзеяньняў, не было і стратэгіі. У астатніх не было і вопыту дэпутацкай працы. Па многіх пытаньнях мы часамі былі занадта наіўнымі. Высьветлілася, што стварыць апазыцыю і разгарнуць яе канкрэтную працу ў Гарсавеце — справа не такая простая і нам не пад сілу. Актыўныя "працаўнікі" ў фракцыі былі. Але неставала лідэра, які б аб'яднаў усіх нас сваёй волей, інтэлектам, ясным бачаньнем "тактыкі" і "стратэгіі" і ўменьнем сказаць рэжыму цьвёрдае "НЕ", калі таго вымагала сітуацыя.

Напрыклад, нашае рашэньне аб нацыянальнай сымволіцы ніхто не адмяняў, і Бел-Чырвона-Белы сьцяг мог бы заставацца над гарадзкой уладай і пасьля ганебнага рэфэрэндуму 1995 году. Вядома, лукашысты знайшлі б крывую дарожку, каб ігнаравать Менгарсавет, але варта было змагацца. Трэба было толькі праявіць настойлівасьць і нязломную волю намесьніку старшыні гарсавета А.Гурыновічу, а адмяніць рашэньне сесіі камуністы-лукашысты не змаглі б (дзвюх трацінаў галасоў для адмены яны б не набралі). Але для змаганьня трэба было быць асобай, не баяцца і ня мець ніякіх зачэпак, якімі б рэжым мог "трымаць" Анатоля.

А "зачэпкі" былі. "Улада" (хоць якая там "улада") моцна ўскружыла яму галаву і "спрычынілася" да зьмяненьня ягонай асобы. Службовы кабінет ён ператварыў у "асабісты" і пачуваўся "панам". Са сваімі непасрэднымі падначаленымі ён абыходзіўся груба, на заўвагі сяброў не рэагаваў. Потым у гэтым самым кабінеце пачаліся і п'янкі ("пасьля работы"), і ўвогуле — непрыстойнасьць. Пра гэта ведаў увесь Гарвыканкам, але яго не чапалі, бо зручна было трымаць на ланцугу "дэмакратычную адзінку" штатнага раскладу Гарвыканкама. Сяброў Анатоль ня слухаў і ніякай маральнай адказнасьці перад тымі, хто яго выбраў, не адчуваў. Пачынаць скандал — не выпадала. Мы ўсе пакутвалі ад гэтага сораму, але выйсьця ня бачылі. Вось табе і фронтаўская кандыдатура. Я чула, што Пазьняк зьбіраўся яго выключыць з БНФ, але да гэтага часу Гурыновіч сам пайшоў у сацыял-дэмакратыю і, здаецца, ці ня быў намесьнікам старшыні Грамады.

Я думаю, што калі чалавек не зьяўляецца самадастатковай асобай, то ў начальства лепш яму не падавацца. Вялікая (і нават малая) улада ды адказная пасада не пойдуць яму на карысьць і стануць горам для іншых. Псаваньне такога чалавека і маральнае зьніжэньне — амаль заканамернасьць. Пасьля 12 красавіка 1995 года (калі Лукашэнка арганізаваў зьбіцьцё дэпутатаў Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце), у наступны ж дзень вестка пра гэта ўстрасянула ўвесь сьвет. Толькі не Менгарсавет, дзе вырашана было адзначыць канец нашай дэпутацкай дзейнасьці — сфатаграфавацца разам усім дэпутатам і пайсьці на "фуршэт", піць шампанскае. Памятаю, нас з Вольгай Кузьміч асабіста запрашаў (!) А. Гурыновіч. На маё абурэньне яго неадэкватнымі заклікамі і дзеяньнямі Анатоль толькі паціснуў плячыма і — пайшоў сьвяткаваць.

Пазьней я бачыла гэтую агульную фатаграфію, на якой з "дэмакратаў" не было, бадай, толькі нас з Вольгай Кузьміч...

Калі ж я цяпер задумваюся над мінулым, то выразна бачу многія нескарыстаныя магчымасьці, якія (упэўнена) паўплывалі б на лёс усёй Беларусі, калі б у Гарсавеце быў лідэр, сьмелы і адданы беларускай незалежнасьці. Бо Менск мог бы стаць прыкладам для ўсёй Беларусі шмат у чым. Закон аб мовах у навучальных установах Менска мог запрацаваць мацней (бо толькі праз нашую мову мы можам быць беларусамі), горад мог бы стаць сапраўды беларускай сталіцай, дзе ўсё было б па-беларуску: і афармленьне, і мова чынавенства. Пачалася б сьвежая ланцуговая рэакцыя разьвіцьця, якая б апасрэдавана ўплывала б на моладзь і іхных бацькоў у станаўленьні нацыянальнай сьвядомасьці. І мы б выйшлі наперад, мы б сталі сапраўднымі беларусамі, задумаліся б аб сваіх нацыянальных інтарэсах і ніхто б нас не ашукаў, не тлуміў бы галаву здаваць Беларусь маскалям "на продаж". Трэба было ўсяго толькі вярнуцца да нацыянальнага гонару, стаць ганаровымі беларусамі. За намі пацягнуліся б гарады і вёскі. Для нацыі патрэбны быў прыклад-штуршок, востра патрэбны, бо энтузіязм 90-х — каштаваў дарагога.

Ахвярная дзейнасьць невялікай купкі гераічнай Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце яскрава прадэманстравала абсурднасьць камуністычнага лёзунгу "незаменимых личностей нет". Ёсьць у гісторыі народа асобы, якіх ні замяніць, ні падмяніць немагчыма. І каб не было нашай слаўнай Апазыцыі БНФ, якую згуртаваў яе лідэр, то, можа, і незалежнасьці ўжо не было б. А яна жыве і будзе жыць, бо існуе вялікая (хоць і пакутная) нацыя — беларусы, і ў яе ёсьць свае Вялікія людзі.

ФРОНТАЎСКІЯ ПЕРАМОГІ Ў МЕНГАРСАВЕЦЕ

Але жыцьцё ішло, падзеяў было шмат. І на кожную пасьпявала рэагаваць Апазыцыя БНФ у Вярхоўным Савеце. Мы ішлі ўсьлед, і за многія нашыя крокі я радуюся і сёньня.

Калі ў жніўні 1991 года ў Маскве адбыўся путч, дэмакратычная частка Прэзыдыюма Гарсавета паспрабавала прыняць пэўную заяву з асуджэньнем перавароту — не атрымалася: камуністы "перацягнулі". Тады мы паспрабавалі правесьці экстранае паседжаньне сесіі Гарсавета — кворуму не хапіла. І мы абралі шлях, якім надалей прыйшлося карыстацца вельмі часта: прынялі заяву дэпутацкага сходу. Для некаторых, магчыма, гэта падасца сёньня ня вельмі важным. Магчыма, але быць дэпутатам і маўчаць, чакаць "большасьці", таксама не выпадала. Думаю, на любым узроўні, які даступны, трэба змагацца, а ня быць пасыўнымі назіральнікамі, калі героі нешта зробяць. Што маглі, мы стараліся рабіць, хоць, зразумела, у дзяржаўным маштабе — вырашалі ня мы.

Пасьля бліскучай перамогі Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце па вяртаньні незалежнасьці Беларусі і прыняцьці Вярхоўным Саветам пад ціскам фронтаўскай Апазыцыі пастановаў "Аб часовым прыпыненьні дзейнасьці КПБ-КПСС на тэрыторыі Беларускай СССР", "Аб дэпартызацыі органаў дзяржаўнай улады і кіраваньня Беларускай ССР, дзяржаўных прадпрыемстваў, установаў, арганізацыяў і маёмасьці КПБ і ЛКСМБ", Менгарсавет стварыў дэпутацкую камісію па кантролю за захаваньнем і выкарыстаньнем маёмасьці КПБ-КПСС і ЛКСМБ. Галасаваньне па складу такой дэпутацкай камісіі было "рэйтынгавае". У выніку большую палову камісіі склалі камуністы ці падпарадкаваныя камуністам. Улік жа гэтай маёмасьці быў, зразумела, у выканкама, дзе выпадковых людзей не было. Таму далейшае разьмеркаваньне маёмасьці фактычна ішло па-за межамі нашага кантролю.

Адказнасьць за захаваньне ўзятай пад ахову маёмасьці была ўскладзена на намесьнікаў старшыні выканкама Ул.Ярмошына і Г.Нікіценку. А супрацоўнічаць абавязалі з Саветам міністраў, якім кіраваў В.Кебіч. Карціна ясная. Вось бы дзе спатрэбілася цьвёрдая рука намесьніка старшыні Гарсавета, якой у "нашага" прадстаўніка А.Гурыновіча, на жаль, не было.

Важнымі рашэньнямі гэтай сесіі яшчэ былі наступныя: а) даручэньне Камісіі па культуры, ахове і адраджэньні гісторыка-культурнай спадчыны ўнесьці на зацьвярджэньне выканкама прапановы па перайменаваньні вуліцаў, плошчаў і выкарыстаньні помнікаў манументальнай прапаганды ў г. Менску; б) падтрымаць рашэньне Прэзыдыюма Вярхоўнага Савета БССР аб уключэньні ў парадак дня наступнай сесіі пытаньня "Аб назве, дзяржаўным гэрбе і дзяржаўным сьцягу Беларускай ССР"; в) падтрымаць пастанову Вярхоўнага Савета БССР "Аб забеспячэньні палітычнай і эканамічнай самастойнасьці Беларускай БССР".

Апазыцыя ў Вярхоўным Савеце дзейнічала апэратыўна і пасьпяхова. Але, на вялікі жаль, пытаньне аб новых выбарах (па ўсё той жа прычыне камуністычнай большасьці) правесьці не ўдалося: улада засталася старая. Але тое, чаго дасягнуць удалося, адкрывала пэўныя магчымасьці і для нас, Гарсавета.

Адным з першых рашэньняў, якога пачала дамагацца Камісія па культуры — гэта зьмена камуністычнай сымволікі ў Менску, перайменаваньне вуліцаў і плошчаў сталіцы, перабудова галоўнай плошчы Менска, дзе стаяў чорны помнік-прывід Леніна.

Працавалі шчыра. За вельмі невялікі час былі падрыхтаваныя і абгрунтаваныя рашэньні аб вяртаньні беларускай сталіцы гістарычнай назвы Менск, аб сьцягу і гэрбе Пагоня на тэрыторыі Менска. Але рашэньні аб уключэньні пытаньня ў парадак дня сэсіі прымаліся Прэзыдыюмам (яго бальшынёй). Тут трэба было пераконваць: многія ў тыя часы проста ня ведалі анічога пра Бел-Чырвона-Белы сьцяг, гэрб Пагоню. А камуністычныя газэты, радыё, тэлебачаньне прыкладалі велізарныя намаганьні, каб абліць грязёй тое, што павінна было б стаць для беларусаў сьвятым.

Пасьля таго, як аргумэнты сяброў нашай камісіі не пераканалі Прэзыдыюм, мы прапанавалі запрасіць на наступнае паседжаньне аўтарытэтных гісторыкаў, якія б прафэсійна патлумачылі гістарычную сітуацыю. Так на першым такім паседжаньні доўга выступаў вядомы гісторык, прафэсар Міхась Ткачоў. Ён доўга расказваў сябрам Прэзыдыюма (на якім я прысутнічала як дэпутат, але без права голасу) гісторыю нашай Беларусі, адкуль, зь якіх часоў да нас дайшоў Бел-Чырвона-Белы сьцяг, гэрб Пагоня, потым доўга адказваў на пытаньні і... не пераканаў (асабліва тых, якім пераканаьні былі не патрэбныя, у іх была пазыцыя). Артадоксы ашчэрыліся "намёртва", былі і тыя, хто ўсё яшчэ "сумняваўся". Тады мы запрасілі вядомага гісторыка і геральдыста А.Цітова, які, здавалася, не пакінуў ніводнай кропкі над "і". Але і гэта было бязвынікова: пераканаць некаторых камуністычных артадоксаў было немагчыма, яны цьвёрда стаялі "супраць". Акрамя таго, у іх быў адзін "галоўны", на іх думку, аргумант: Вярхоўны Савет не прыняў адпаведных рашэньняў па рэспубліцы, як жа, маўляў, мы можам прымаць такія рашэньні раней!

Але мы не здаваліся. Работа з дэпутатамі ішла актыўная, усё былі "на ўздыме". Мы мелі магчымасьць уключыць пытаньне ў парадак дня яшчэ праз галасаваньне ўсіх дэпутатаў на сэсіі (здаецца, дзвюма трацінамі), што нам і ўдалося зрабіць.

І вось 5 верасьня 1991 года на 5-й нечарговай сесіі цаной цяжкага змаганьня Менгарсавет прымае гістарычныя рашэньні аб выкарыстаньні нацыянальнай сымволікі:

1.Устанавіць, што ў горадзе Менску разам з дзяржаўнай сымволікай БССР выкарыстоўваецца беларуская нацыянальная сымволіка — БелЧырвона-Белы сьцяг і гэрб "Пагоня".

2.Усталяваць разам з дзяржаўным сьцягам БССР нацыянальны Бел-Чырвона-Белы сьцяг над будынкам Менгарсавета і ў залі паседжаньняў сэсіі Менгарсавета.

Калі такое рашэньне пры галасаваньні "прайшло", мы не маглі ў гэта паверыць: яшчэ існавала БССР, над будынкам Вярхоўнага Савета вісеў сымвал рэспублікі СССР, а над будынкам насупраць, над гарадзкой уладай будзе лунаць наш нацыянальны сьцяг! Гэта і зараз, праз шмат гадоў, прымушае ганарыцца няхай сабе і не такой маштабнай, але перамогай.

Цікава, што за некалькі дзён да прынятага рашэньня аб узьняцьці нацыянальнага сьцяга над будынкам Гарсавета, наш сьцяг ужо залунаў над ім. Знайшліся сьмелыя людзі, якія яго там умацавалі. Правісеў наш сьцяг каля гадзіны, пакуль заўважылі. А вось 5 верасьня, як толькі рашэньне было прынятае, мы ўжо павесілі яго законна і неадкладна: усё было падрыхтавана заранёў. Ніхто ня ведаў яшчэ пра прынятае рашэньне. Зноў пачаўся перапалох: зьняць! А не ўдалося!

Праз два тыдні гістарычнае рашэньне па сымволіцы прыняў Вярхоўны Савет: Бел-Чырвона-Белы сьцяг і гэрб Пагоня сталі дзяржаўнымі і залуналі па ўсім нашым краі. Памятаю гэты дзень 19 верасьня 1991 года. Нягледзячы на сьвята, З. Пазьняк, В. Голубеў і некаторыя іншыя дэпутаты Апазыцыі яшчэ доўга знаходзіліся ў Вярхоўным Савеце — былі неадкладныя фронтаўскія справы.

Валянцін трохі нэрваваўся, ён сьпяшаўся дадому на сямейнае сьвята. Мы былі блізкімі сябрамі, і Валянцін запрасіў З. Пазьняка, Анатоля Трыпуціна і мяне дадому, каб пабыць разам, адзначыць сьвята Беларускага Сьцяга, парадвацца.

Каля 21-й гадзіны мы ўтраіх выйшлі зь Вярхоўнага Савета, па дарозе наперабой абмяркоўваючы, як назаўтра ва ўрачыстай абстаноўцы будзе ганарова ўзьняты над Домам ураду наш Сьцяг і гэта стане сапраўднай нацыянальнай падзеяй. Але на вуліцы мы проста аслупянелі ад нечаканасьці: над будынкам Вярхоўнага Савета замест савецкага чырвона-зялёнага ўжо разьвіваўся Бел-Чырвона-Белы Сьцяг, які ціхенька быў павешаны позна вечарам, у цемры, як высьветлілася назаўтра, па распараджэньні С.Шушкевіча. Мы глядзелі ўгару, і нас перапаўнялі супярэчлівыя пачуцьці. З аднаго боку — шчасьце нарэшце ўбачыць наш сьвяты Сьцяг над Домам Ураду. Зь іншага — урачыстае агульнанацыянальнае сьвята было сапсаванае. Усё было зроблена ціха, каб не надаваць гістарычнай падзеі належны розгалас. Не разумець значэньня падзеі старшыня Вярхоўнага Савета С.Шушкевіч ня мог. Дык што ж гэта за ўчынак?..

5 верасьня 1991 года сэсія Менгарсавета прыняла яшчэ адно важнае рашэньне:

1.Пацьвердзіць гэрб, нададзены гораду 12.01.1591г. у выніку атрыманьня Магдэбурскага права ў 1499 г.

2.Зьвярнуцца ў Вярхоўны Савет БССР з прапановай адмяніць рашэньне 2-й сесіі Вярхоўнага Савета 1-га склікання ад 29 ліпеня 1939г., згодна зь якім горад Менск быў перайменаваны ў Мінск.

У выніку прынятага рашэньня ў зале паседжаньняў Менгарсавета неўзабаве была ўсталяваная выява гістарычнага герба Менска ўзору 1591 года.

6 верасьня, зыходзячы з Дэклярацыі аб суверэнітэце, прынятай Вярхоўным Саветам, дэпутаты горада прынялі яшчэ адно рашэньне. Камісіі па культуры было даручана "...на працягу верасьня 1991г. рашыць пытаньне аб перайменаваньні плошчы Леніна і Ленінскага праспэкта". Гэтае рашэньне было пасьпяхова выканана: галоўная плошча сталіцы атрымала назоў плошчы Незалежнасьці, а яе галоўны праспэкт — імя славутага беларуса Францыска Скарыны.

Менгарвыканкаму даручалася распрацаваць і да 1.03.1993 г. ажыцьцявіць комплекс мерапрыемстваў па добраўпарадкаваньню галоўнай плошчы сталіцы, зыходзячы з наступнага:

— замяніць помнік Леніну на архітэктурна-мастацкую кампазицыю, якая б сымвалізавала суверэнітэт і незалежнасьць Беларусі, нацыянальнае адраджэньне народа.

Для распрацоўкі праекта вырашана было аб'явіць рэспубліканскі конкурс. Але завяршыць гэтую работу не ўдалося...

«МЕДНЫЯ ТРУБЫ» ГАРСАВЕТА

У пачатку 90-х ніякіх іншых палітычных арганізацыяў, акрамя Фронту, не было. Таму ўсе, хто жадаў пераменаў, лічыліся "нефармаламі" (што ў грамадзтве атаесамлівалася з Фронтам), хоць на справе фронтаўцамі былі далёка ня ўсе "дэмакраты". Некаторыя дбалі пра будучыню Беларусі толькі пасьля таго, як вырашацца іхныя ўласныя інтарэсы. А калі трэба было выбіраць паміж першым і другім, то, не вагаючыся, выбіралі асабісты камфорт. (Пазьней гэтыя "дэмакраты" адкрыта будуць езьдзіць да нашых непрыяцеляў у Маскву і прасіць іхнай "дапамогі" "ўтаймаваць" Лукашэнку.) Гэты падзел на адраджэнцаў і псэўдаадраджэнцаў ("дэмакратаў") пачаўся ўжо тады і ў Гарсавеце.

Пасьля таго, як некаторыя "дэмакраты" былі абраныя дэпутатамі, шмат для каго прыйшоў час выпрабаваньня "меднымі трубамі", якога яны ня вытрымалі.

У "вышэйшы эшалон" улады былая намэнклятура "чужых" не пускала, але дэпутатцтва ўсё ж нейкія "лазанкі" ва ўласны дабрабыт адчыняла, і некаторыя, з'арыентаваўшыся, пачалі асабістае ўладкаваньне, выкарыстоўваючы дэпутацкі білет. Такія "аматары" скрозь былі сярод намэнклятуры, але гэта быў іхны "сьвет", іхняя "норма". Яны й пры саветах выкарыстоўвалі службовае становішча, стаўшы дэпутатамі — выкарыстоўвалі "дэпутацтва". Гэта было ў іх правілам, яны былі там свае сярод сваіх.

Іншая справа — "новенькія", "дэмакраты", якія казалі пра "народныя інтарэсы". На "дэмакратаў" глядзелі як праз павелічальнае шкло і заўважалі ўсе хібы. Быў адзін такі дэпутат (П.), які гучна крычэў супраць "прывілеяў", а як стаў старшынём адной з камісіяў, дык пачаў набываць для сябе ўсялякія дэфіцытныя на тыя часы тавары, што проста так купіць было немагчыма. Пра гэта (і іншае) мне расказвалі супрацоўнікі Гарвыканкама, якія адносіліся да мяне з павагай. Яны расказвалі пра "чужых" з асуджэньнем (праўда, калі "свой" рабіў нешта незаконна — гэта было як бы нормай і пра гэта маўчалі).

Было, канечне ж, прыкра, што "дэмакраты" купляюцца на нейкую матэрыяльшчыну. На той агульнадэмакратычнай хвалі людзі неяк спадзяваліся, што "новыя" — значыць, усе падрад сумленныя, "чыстыя" на руку.

Быў сярод нас такі дэпутат (К.), які напачатку ўдаваў барацьбіта за нацыянальныя інтарэсы ў Гарсавеце. Але паступова "ўцяміў", што прыдбаць асабіста са сваёй "беларускасьці" нічога ня зможа, неяк спахмурнеў і ўсюды пачаў падкрэсьліваць, што ён быццам бы "паляк" (выглядала, што "беларускія" справы ўжо як бы і "не ягоныя"). Яго дэпутацкая актыўнасьць зьмянілася пасыўнасьцю, ён часта прапускаў паседжаньні і займаўся асабістымі праблемамі.

Здаецца, у 1993 годзе ў яго ўзьніклі праблемы з працай, і ён стараўся ўладкавацца ў эканамічным аддзеле Гарвыканкама. Тым ня менш А.М.Герасіменка яму катэгарычна адмовіў і сказаў аб гэтым В.Кузьміч. "Я не вазьму яго на працу ў Гарвыканкам, і не таму, што К. з дэмакратаў. А вось Галіну Фёдараўну вазьму на пасаду інспэктара Гарвыканкама па выкананьні Закона аб мовах", — так вырашыў Аляксандар Міхайлавіч, нягледзячы на тое, што я была ня проста "з дэмакратаў", а прадстаўніком БНФ.

***

Дэпутацкія камісіі ў будынку Гарсавета-Гарвыканкама разьмяшчаліся ў асноўным на 4-м паверсе. Адзін даволі вялікі пакой афіцыйна належаў камісіям па адукацыі і па культуры (гэта на часы сэсіі і калі адбываліся паседжаньні камісіяў). Гэты пакой быў і афіцыйным месцам працы Вольгі Кузьміч (як вызваленага старшыні дэпутацкай камісіі) і маім (як інспэктара Гарвыканкама). Але кожны дэпутат з камісіяў мог узяць ключ ад кабінету, калі нас не было, і займацца дэпутацкімі справамі.

Аднаго разу да нас з Вольгай Кузьміч прыйшлі з бухгалтэры і паказалі нам проста астранамічныя рахункі за тэлефонныя размовы. "Дзяўчаты, вы надта шмат размаўляеце з замежжам", — сказала нам супрацоўніца бухгалтэрыі.

У нас акругліліся вочы: "Зь якім замежжам?" Мы разам паглядзелі рахункі. Арабскія Эміраты, Ізраіль і г.д.

Гэта быў сапраўдны ўдар, бо мы, безумоўна, ні зь якой замежнай краінай ніякіх перамоваў не вялі, тым больш без дазволу кіраўніцтва. Потым высьветлілася, што адзін дэпутат Ш. браў на вахце ключ і тэлефанаваў па сваіх прыватных бізнэсовых патрэбах за дзяржаўны кошт, ведаючы, што адказнасьці на ім ня будзе. (Пасьля прыходу да ўлады Лукашэнкі гэты "дэмакрат" адмовіцца ад беларускасьці і прыстасуецца да лукашызма.)

Грошы за рахунак аплаціў Гарвыканкам, але па нашай просьбе ключ ад пакою больш не давалі нікому, акрамя нас з Вольгай.

***

Паколькі я заўсёды падкрэсьлівала, што зьяўляюся прадстаўніком Фронту, мяне ня раз спрабавалі спакусіць на "прывілеі". Успамінаецца адзін выпадак.

Неяк выклікае мяне да сябе першы намесьнік старшыні Гарвыканкама спадар У. Ярмошын і паведамляе, што ён быў у камандзіроўцы на Кіпры ("якая краіна!"). Там вельмі шчыра адгукнуліся на нашую чарнобыльскую бяду і прапанавалі за свой кошт прыняць беларускіх дзяцей на аздараўленьне. "Я б хацеў, каб вы, Галіна Фёдараўна, і заняліся фарміраваньнем гэтай групы дзяцей (40 дзетак) і суправаджалі іх на адпачынак на Кіпр, бо трэба, каб ад Гарвыканкама была сабраная група не "блатных" дзяцей, а якім сапраўды патрэбнае такое аздараўленьне", — прапанаваў мне спадар Ярмошын.

Паколькі я займалася гэтымі пытаньнямі ў Фронце і мне дапамагалі лекары-эндакрынолагі, я пагадзілася і заверыла, што ў групу ўвойдуць толькі тыя дзеці, каму гэта неабходна з мэдычных паказчыкаў.

На наступны дзень спадар Ярмошын пазнаёміў мяне з двума кіпрскімі прадстаўнікамі, якія былі ў Менску па запрашэньні Гарвыканкама. Мы гаварылі пра чарнобыльскія праблемы, пра беларускіх дзяцей і дамовіліся, што група будзе сабраная і па іхным запрашэньні мы прыедзем да іх на Кіпр.

Праз пару дзён спадар Ярмошын паведамляе мне, што дае мне ў дапамогу нейкага спадара Высоцкага, каб мы разам займаліся гэтай працай.

Прыйшоў той Высоцкі. Мы паразмаўлялі, і я сказала, што галоўнае слова будзе за лекарамі. "Так, так, Галина Федоровна, — адразу пагадзіўся ён. Але пазьней вырашыў пагаварыць са мной "доверительно". — Вы все говорите правильно. Но вы же понимаете, что есть люди, которым город обязан, которые помогут нашей группе, чтобы было все комфортно, ну, вы сами все понимаете. Одним словом, в эту группу надо взять 8—9 детей этих нужных людей. С начальством все урегулировано".

Я сказала цьвёрда і катэгарычна: "Не, так ня будзе. У групу ўвойдуць толькі тыя дзеці, якім гэта будзе неабходна па стану здароўя. Калі дзеці "нужных людей" хворыя — калі ласка. Калі не, то яны ня зоймуць месца хворых.

Спадар Высоцкі пачаў нешта даказваць, але потым перайшоў на пагрозы. Я сказала, што групу ўзначальваю я, і ўсё будзе толькі сумленна, ніякага вашага "блату". Спадар Высоцкі бразнуў дзьвярыма, і пасьля гэтага "справа" неяк заціхла і зусім зглохла, усе мае высілкі натыкаліся на чыноўніцкую сьцяну, на нежаданьне нешта рабіць.

А зараз я думаю, што мяне проста хацелі спакусіць экзатычным бясплатным адпачынкам на Кіпры ўзамен за "згоду" на іхныя махінацыі, а потым маніпуляваць мной як прадстаўніцай Фронту. Ня выйшла — і група на Кіпр не паехала, ці, можа, паехала, ды толькі без мяне. Але мяне гэта ўжо ня тычылася.

(Працяг будзе.)



МІНСКІ ГАРАДСКІ САВЕТ НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
РАШЭННЕ
от 15 мая 1990 № 258

МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ СОВЕТ НАРОДНЫХ ДЕПУТАТОВ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
РЕШЕНИЕ



БССР
МІНСКІ ГАРАДСКІ САВЕТ НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ
РАШЭННЕ
от 5 верасня 1991 № 170

БССР
МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ СОВЕТ НАРОДНЫХ ДЕПУТАТОВ
РЕШЕНИЕ
5-й внеочередной сессии XXI созыва

БССР
МІНСКІ ГАРАДСКІ САВЕТ НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ
РАШЭННЕ
от 5 верасня 1991 № 168

БССР
МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ СОВЕТ НАРОДНЫХ ДЕПУТАТОВ
РЕШЕНИЕ
5-й внеочередной сессии XXI созыва

КАМПЕТЭНТНА

«Прайсці дыспансерызацыю можа кожны жадаючы»

2008 год у краіне аб'яўлены Годам здароўя. Міністэрства аховы здароўя ў сувязі з гэтым абвясціла агульную дыспансерызацыю насельніцтва. Што гэта такое, высвятляў карэспандэнт "Народнай волі": ён адправіўся ў паліклініку па месцы жыхарства.

Мінская паліклініка №28 знаходзіцца ва Уруччы на вуліцы Гінтаўта. На дзвярах паліклінікі ніякіх аб'яў, якія датычацца ўсеагульнай дыспансерызацыі насельніцтва, няма. Ёсць толькі надпіс аб тым, што хворых з тэмпературай прымаюць у кабінеце №215.

Заходжу ўнутр, падыходжу да рэгістратуры:

— Добрай раніцы, я хацеў бы прайсці дыспансерызацыю, куды мне звярнуцца? — пытаюся ў супрацоўніцы. Тая без слоў аддае мне на рукі маю амбулаторную картку і накіроўвае ў стол даведак.

Там у сваю чаргу раяць узяць талон на прыём да ўчастковага тэрапеўта, які і выпіша ўсе неабходныя накіраванні. Шчыра кажучы, такім стаўленнем да сябе я быў прыемна здзіўлены. Значыць, аб'яўленая ў краіне дыспансерызацыя — рэальнасць, а не міф. Для таго каб падрабязней даведацца, што такое *дыспансерызацыя* і навошта яе праводзіць, звярнуўся да намесніцы галоўнага ўрача паліклініцы **Ірыны Палявой**:

— Дыспансерызацыя ўключае ў сябе комплекс мер, скіраваных на выяўленне хвароб на ранняй ступені, — тлумачыць Ірына Віктараўна. — Такое абследаванне кожны павінен праходзіць хаця б раз на год.

— Я ўжо высветліў, што перад пачаткам абследавання неабходна звярнуцца да тэрапеўта. Што далей?

— На першасным прыёме ваш участковы тэрапеўт выпіша накіраванні на аналізы крыві і мачы. Людзі ва ўзросце ад 40 гадоў акрамя агульнага аналізу крыві ў абавязковым парадку здаюць аналіз на ўтрыманне цукру ў крыві. Да таго ж у межах дыспансерызацыі неабходна наведаць флюараграфічны кабінет, а таксама зрабіць кардыяграму сэрца.

— У якім выпадку пацыента ставяць на дыспансерны ўлік?

— У выпадку, калі аналізы, флюараграфія ці кардыяграма пакажуць адхіленне ад нормы. Потым хворым займаецца профільны доктар.

— Ірына Віктараўна, ці праўда, што дыспансерызацыя будзе бясплатнай?

— Усе аналізы і абследаванні — абсалютна бясплатныя.

— А дактароў на ўсіх хопіць? Вядома, што ў нашых паліклініках дэфіцыт урачоў...

— Праблема сапраўды існуе. Але спадзяюся, што мы справімся. Жадаючых прайсці дыспансерызацыю пакуль няшмат.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

МАЙЦЕ НА ЎВАЗЕ

Пастановай Міністэрства аховы здароўя вызначаны спіс медыцынскіх даследаванняў для трох узроставых груп.

Калі вам 35—45 год, вы можаце прайсці агляд тэрапеўта, здаць агульны аналіз крыві, у тым ліку і на ўтрыманне цукру, агульны аналіз мачы, прайсці флюараграфію і зрабіць кардыяграму. Пры неабходнасці тэрапеўт прапануе вам агляд эндакрынолага.

Калі вам 45—50 год, то да вышэйзгаданых абследаванняў дабаўляецца таксама біяхімічны аналіз крыві для выяўлення ўзроўню халестэрыну ў крыві, а таксама даследаванне ПСА для мужчын (для дыягностыкі рака прастаты) і агляд гінеколага для жанчын.

Пацыентам, якім больш за 50 год, прапаноўваецца таксама кансультацыя акуліста і даследаванне дна вока.

Прайсці дыспансерызацыю могуць і ўсе жадаючыя да 35 год.

Кампанія распачата для таго, каб не прапусціць хваробу на яе пачатку. Чыноўнікі Мінздрава спадзяюцца, што дыспансерызацыя паспрыяе ранняй дыягностыцы многіх захворванняў.

Ці прыжывецца ў Беларусі гэтая практыка, вядомая яшчэ з савецкіх часоў, казаць рана. Дыспансерызацыя аб'яўлена толькі на 2008 год. Аднак дадатковыя фінансавыя сродкі на кампанію не выдзелены, ніхто не падлічваў, колькі яна будзе каштаваць бюджэту. Вядома толькі, што адно наведванне ўрача паліклінікі з абавязковымі абследаваннямі ацэньваецца ў 11 тысяч беларускіх рублёў.

ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ

Недзіцячы рэкорд

У 2007 годзе ў Беларусі нарадзілася больш за сто тысяч дзяцей — упершыню за апошнія некалькі гадоў.

Аб гэтым журналістам паведаміла намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна Шаметавец.

Паводле яе даных, у 2007 годзе ў Беларусі нарадзілася больш за 103 тыс. дзяцей. Рост нараджальнасці абумоўлены вялікай колькацю жанчын, якія ўступілі ў дзетародны ўзрост. Каля 70% дзяцей нараджаюцца маці ва ўзросце 20—29 гадоў. *"Калі зыходзіць з гэтай узроставай структуры жанчын, то нараджальнасць у краіне будзе павялічвацца да 2010—2011 года,* — паведаміла Таццяна Шаметавец. — *А потым зноў будзе спад"*.

Таццяна ДАРАШЧОНАК.

РЕГИСТРАТУРА

Наши дворы и школы опасны для детей

Специалисты РНПЦ травматологии и ортопедии бьют тревогу: в стране растет детский травматизм. Врачей, способных оказать квалифицированную помощь, не хватает.

Сегодня бытовой травматизм составляет около 70% от общего количества детских травм. Малыши получают повреждения при падении во время бега и ходьбы, прыгая с высоты, ударяясь о различные предметы. Среди травм — ранения режущими и колющими предметами, ожоги вследствие контакта с химическими и бытовыми веществами, отравления лекарствами, найденными в доме. За 2007 год только в детскую травматологическую службу Минска обратилось 30.753 ребенка и подростка. По сравнению с 2006 годом детский травматизм увеличился на 12%, а подростковый — на 30%.

Дети младшего школьного возраста в основном получают травмы во время игр. 78% из них приходится на игры во дворе, остальное — на улицах и в помещениях. Причины разные: падения, повреждения транспортными средствами, различные ранения. Дети постарше нередко получают травмы в школе (около 10%). Падают с лестниц, прищемляют пальцы дверьми, рамами окон. Зачастую серьезными травмами заканчиваются драки ранцами и учебниками, подножки, столкновения во время бега.

Особенное внимание специалисты по детскому травматизму обращают на безопасность детей во время занятий спортом. Причин этому очень много. Среди главных — организация занятий без учета физической и технической подготовленности школьников, нехватка мест для тренировок, слабая материальная база белорусских школ, низкая дисциплина во время уроков физкультуры и недостаточный врачебный контроль.

К слову, специалисты РНПЦТО замечают, что в стране катастрофически не хватает детских травматологов-ортопедов, а те врачи, к которым обращаются травмированные дети, не всегда готовы оказать квалифицированную помощь. Так, 20% детских травматологов имеют вторую врачебную категорию, 30% — первую категорию, а половина врачей вообще не имеет квалификационной категории, им необходимо пройти курсы повышения квалификации. Укомплектованность в поликлиниках и стационарах Минска детскими травматологами-ортопедами составляет от 57 до 64%.

Галина ЕФИМОВА.

Беларусь ежегодно теряет 400 врачей

Одни уходят из отрасли, а некоторые уезжают за рубеж.

Данную статистику озвучил на встрече с журналистами начальник управления кадровой политики, учреждений образования и внешних связей Министерства здравоохранения **Сергей СЫЧИК**.

Тем временем в Беларуси отмечается равномерная неукомплектованность кадров по всем врачебным специальностям. По словам чиновника, в прошлом году потребность лечебных организаций в кадрах была выполнена лишь на 40%. В связи с этим был увеличен прием студентов в медицинские вузы страны. *"Так, в прошлом году принято 2735 человек, тогда как выпущено 1873 человек",* - сообщил он.

Однако, высказал мнение Сергей Сычик, увеличение приема в вузы не решит кадровые проблемы здравоохранения в целом — их надо решать в комплексе. По мнению представителя Минздрава, людей надо заинтересовывать жильем, заработной платой и хорошими условиями для профессионального роста.

С.Сычик подчеркнул, что сегодня важно "закрепить кадры на местах", чтобы был меньше отток специалистов как из отрасли в другие сферы, так и за рубеж. Он отметил, что в последнее время выпускники направляются в основном в амбулаторно-поликлиническую службу. По данным представителя Минздрава, до 80% выпускников за последние четыре года были трудоустроены в поликлиниках. *"Это правильный приоритет"*, — подчеркнул чиновник.

БелаПАН.

РЕКОМЕНДОВАНО

По статистике, самым частым видом травмы у детей является травма кисти. Наиболее часто она наблюдается у ребят в возрасте 7—14 лет. Специалисты РНПЦ травматологии и ортопедии разработали даже памятку для родителей: "Травма кисти у детей: доврачебная помощь. Осложнения и прогноз".

Поверхностные раны и ссадины. При этих травмах родители в большинстве случаев не обращаются к врачу, ограничиваясь в лучшем случае применением антисептиков (йод, раствор перекиси водорода и др.). Самолечение чревато двумя опасностями: во-первых, рана нагнаивается и не заживает длительное время, и, во-вторых, имеется вероятность заражения столбняком, особенно у детей, плановые прививки которым могут быть отложены по разным причинам.

Раны от укусов опасны тем, что в большинстве своем они возникают от укуса бродячих или дворовых животных, не привитых от бешенства. Помимо угрозы заболевания бешенством и столбняком эти раны быстро нагнаиваются и очень медленно заживают.

Распространенное мнение о том, что **ожоги** кипятком поверхностны и сравнительно не опасны, лишено всяких оснований. У детей первых трех—пяти лет жизни они могут быть очень глубокими и приводить к тяжелым деформациям кисти, требующим оперативного вмешательства, иногда многоэтапного.

Электроожоги особенно коварны: при небольшой площади ожога они очень глубоки — с поражением всех тканей вплоть до кости, а также подвержены нагноению и очень медленно заживают.

Колотые раны, вызываемые предметом с небольшой острой поверхностью (спица, ножницы, нож, отвертка, осколок стекла и др.), особенно опасны, так как они при малой поверхности достигают значительной глубины и могут повредить сосуды, нервы и сухожилия, расположенные под поверхностью, то есть в области запястья и пальцев.

При огнестрельных ранениях — взрывах самопала, баллончика для сифона и др. — в кисть попадают осколки, которые могут повредить сосуды, нервы, сухожилия и мышцы. Извлечение осколков, особенно стекла, — довольно сложное вмешательство, так как их нельзя обнаружить при рентгенологическом обследовании.

Некоторые **переломы** специфичны для детей. Например, при играх в мяч (волейбол, баскетбол и т.д.) у нетренированных детей часто бывает перелом основания фаланги мизинца. При несвоевременном лечении открытого перелома в результате осложнений нарушения функции кисти могут остаться пожизненно.

Ампутация кончиков пальцев и фаланг наблюдается при ущемлении пальцев в дверях автомобиля, при попадании пальцев в мясорубку, хлеборезку и другое. Чаще всего повреждаются мягкие ткани кончика пальца, которые отрываются вместе с ногтем. Оперативное вмешательство является сложным, включает в себя и пересадку кожи.

ХОРОШАЯ НОВОСТЬ

Вильям Новик будет оперировать маленьких белорусов

В нашу страну детский кардиохирург из США приехал в 13-й раз

Вильям Новик прилетел в Минск из родного Мемфиса. Планируется, что в Минске кардиохирург и его бригада пробудут неделю и проведут не менее 14 операций детям с тяжелым пороком сердца. Работать бригада будет в Республиканском детском кардиологическом центре. Как и в прошлые визиты, зарубежные специалисты будут выполнять те операции, которые пока не делают белорусские детские кардиохирурги.

За время предыдущих визитов зарубежные специалисты провели уже 396 операций. Программу финансирует американское правительство, Министерство здравоохранения Беларуси и Белорусский детский фонд. В 2006 году в интервью нашей газете Вильям Новик рассказывал: *"Все, даже самые дорогостоящие операции, мы проводим бесплатно. Как и в других странах мира, где также осуществляется международная программа "Детское сердце". Гонорары, если так можно сказать, нам платит американское правительство. В том, что наша международная программа осуществляется в Минске, заслуга также и бывшего посла США в Беларуси Джорджа Крола. Он поддержал эту программу в США, потому что видел, что белорусское правительство со своей стороны заинтересовано в ее осуществлении и тоже инвестирует средства в эту программу"*.

Беларусь — не единственная страна, где оперирует доктор Новик. *"Каждый год я выполняю более 200 сложнейших операций. Стараюсь помочь детям там, где им не оказывают никакой помощи или она недостаточна: в Колумбии, Перу, Пакистане, Китае. А вообще, международная программа "Детское сердце" осуществляется более чем в 10 странах мира",* — признался в интервью "Народной воле" американский кардиохирург.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

ЭПІКРЫЗ

Мілінкевіч праходзіць курс рэабілітацыі

Кіраўнік аргкамітэта руху "За Свабоду" Аляксандр Мілінкевіч выпісаўся з варшаўскай клінікі, дзе 24 студзеня яму была зроблена лапараскапія ныркі (выдаленне каменя).

Як паведаміў БелаПАН намеснік лідэра руху "За Свабоду" Юрый Губарэвіч, аперацыя прайшла паспяхова. Паводле яго слоў, польскую клініку А.Мілінкевіч выбраў, паколькі там практыкуе яго даўні знаёмы -- доктар, у якога палітык кансультуецца працяглы час.

Паводле слоў Ю.Губарэвіча, цяпер па рэкамендацыі ўрачоў А.Мілінкевіч павінен вытрымаць рэабілітацыйны перыяд -- адпачыць некаторы час. Тым не менш, як зазначыў намеснік кіраўніка руху "За Свабоду", палітык ужо на гэтым тыдні плануе вярнуцца ў Беларусь, каб прадоўжыць паездкі па рэгіёнах, сустрэчы з грамадзянамі для абмеркавання грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне.

КАНСУЛЬТАЦЫЯ

Спяшайцеся да медыкаў, а то паспяшаецеся на той свет

Прыкладна чвэрць пацыентаў сталічнага анкалагічнага дыспансера звяртаюцца да медыкаў з запушчанай формай захворвання. Пра гэта паведаміў галоўны ўрач Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансера Зігмунд Гядрэвіч на пасяджэнні "круглага стала" ў Мінску.

Разам з тым, паводле яго слоў, паспяховае лячэнне анкалагічных хвароб у многім залежыць ад своечасовага звяртання пацыентаў. Таксама ён заўважыў, што лячэнне раку "складаецца з многіх кампанентаў", і дапамога экстрасэнсаў і знахараў тут не пажадана.

Зігмунд Гядрэвіч развеяў некалькі міфаў наконт раку. Так, ёсць меркаванне, што *"пухліну нельга апраменьваць, таму што гэта радыеактыўнае апраменьванне, а радыяцыі пасля Чарнобылю ў нас і так хапае". "Прамянёвая тэрапія выкарыстоўвалася ў лячэнні раку задоўга да Чарнобыля, прычым гэты метад дае цудоўныя вынікі"*, — сказаў спецыяліст. Таксама бытуе стэрэатып, што анколагі праводзяць "аперацыі, якія калечаць", гэта значыць адразаюць малочныя залозы і іншыя органы. Паводле слоў З.Гядрэвіча, да 60% аперацый, якія выконваюцца анколагамі на сучасным этапе, органазахавальныя. Рашэнне аб выдаленні якога-небудзь органа прымаецца толькі пры пагрозе жыцця пацыента.

Апрача таго, некаторыя пацыенты адмаўляюцца ад хіміятэрапіі, бо "ад яе выпадаюць валасы", або гармонатэрапіі, паколькі "ад яе можна патаўсцець", у той час як, падкрэсліў анколаг, пры лячэнні злаякасных пухлін "пытанне ставіцца аб жыцці і смерці пацыента".

На ўліку ў анкалагічнай службе сталіцы знаходзяцца больш як 39 тыс. чалавек. У 2007 годзе зарэгістравана 7283 новыя выпадкі захворвання (2006 г.— 7034, 2005 г. — 7057). Смяротнасць ад анкалагічных захворванняў у 2007 годзе склала 170,5 на 100 тысяч насельніцтва (2006 г. — 176,1, 2005 г. — 174,9). Паводле слоў З.Гядрэвіча, на 250 чалавек у сталіцы прыпадае адзін хворы на злаякасную пухліну, прычым большасць з іх — людзі працаздольнага ўзросту.

Таццяна ДАРАШЧОНАК.

РЭЦЫДЫЎ

Фармавытворцы падкупляюць урачоў і правізараў?

У бліжэйшыя месяцы ў Беларусі будзе створаны грамадскі савет па разглядзе выпадкаў неэтычнага прасоўвання лекавых сродкаў фармацэўтычнымі кампаніямі. У яго ўвойдуць спецыялісты Міністэрства аховы здароўя, а таксама прадстаўнікі прафесійных грамадскіх аб'яднанняў і асацыяцый, міжнародных фармацэўтычных вытворцаў, якія працуюць у Беларусі, СМІ. Аб гэтым паведаміў 31 студзеня ў Мінску на рэспубліканскай нарадзе "Этычнае прасоўванне лекавых сродкаў" намеснік міністра аховы здароўя Валерый Шаўчук.

Ён зазначыў, што ў Беларусі некаторыя фармацэўтычныя кампаніі ажыццяўляюць стымуляванне ўрачоў і фармацэўтычных работнікаў, "якія прасоўваюць па просьбе зацікаўленага боку, г.зн. вытворцы, пэўныя лекі пры дапамозе рэкамендацый, выпіскі рэцэптаў лекаў пэўных вытворцаў". На думку В.Шаўчука, гэта не толькі неэтычна, але часам парушае заканадаўства аб рэкламе і іншыя заканадаўчыя акты.

Загадчык кафедры клінічнай фармакалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага універсітэта прафесар Міхаил Кеўра зазначыў у сувязі з гэтым, што, *"прасоўваючы лекавыя сродкі, вытворцы часта не паведамляюць спажыўцу пра пабочныя эфекты ад лячэння прэпаратам, даюць аднабокую інфармацыю, падаючы лекі як панацэю ад усіх хвароб"*.

Асаблівую ўвагу ў сувязі з гэтым, лічыць спецыяліст, трэба надаць удасканаленню заканадаўчай базы, якая тычыцца актыўнай рэкламы, калі прадстаўнік кампаніі - вытворцы лекаў прыходзіць да канкрэтнага ўрача або фармацэўта і прапаноўвае свой прадукт.

Алена СПАСЮК, БелаПАН.

ПЫТАННЕ—АДКАЗ

Лячыцца за грошы можна без накіравання

У "Народнай волі" за 27 кастрычніка 2007 г. прачытала заметку "Валерый Фралоў за платныя медыцынскія паслугі", у якой генерал расказвае пра тое, як лячыўся ў 10-й сталічнай клініцы. Бальніца аказвае платныя медыцынскія паслугі, чым спадар Фралоў быў вельмі задаволены.

Я жыву ў Смаргоні, маю праблемы страўнікава-кішачнага тракту. Ці магу я звярнуцца ў 10-ю бальніцу за платнай кансультацыяй? Атрымаць накіраванне на абследаванне ў нас вельмі цяжка, а магчымасці раённай бальніцы вядомыя...

г.Смаргонь.

Атрымаць платную кансультацыю ў 10-й клінічнай бальніцы Мінска можа любы жыхар Беларусі, незалежна ад таго, дзе ён жыве — у Мінску альбо па-за яго межамі. У рэгістратуры платных паслуг бальніцы нам паведамілі, што абследаванні страўнікава-кішачнага тракту яны не праводзяць і параілі звярнуцца ў Бальніцу хуткай дапамогі. Аднак у дадзены момант у гэтай медыцынскай установе праводзіцца рамонт, аддзяленне гастраэнтэралогіі пераведзена ў 2-ю клінічную бальніцу Мінска, а ліцэнзія на аказанне платных медыцынскіх паслуг урачом-гастраэнтэролагам прыпынена. Аднак з дня на дзень, падказалі нам у рэгістратуры платных паслуг 2-й бальніцы г.Мінска, гэта ліцэнзія будзе атрымана.

Алеся КОВАЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
7 ЛЮТАГА 2008 г.

КАЛЯНДАР

памятных дат Беларусі на 2008 год

Каля 1500 гадоў таму працягвалася рассяленне славянскіх плямёнаў з Балканаў, Палесся і Палабіі па тэрыторыі сучаснай Беларусі, на якой жылі балты.

Пачалася славянізацыя тэрыторыі і працэсы стварэння беларускага этнасу (VI стагоддзе).

1020 гадоў таму Рагнеда заснавала жаночы кляштар у Заслаўі (988 г.).

940 гадоў таму полацкі князь Усяслаў быў абраны на кіеўскі пасад (15 верасня 1068 г.).

930 гадоў таму адбыўся паўторны паход Уладзіміра Манамаха на Полацк (зіма 1078 г.).

930 гадоў таму з'явіліся першыя летапісныя звесткі пра Лагойск (1078 г.).

835 гадоў таму памерла Еўфрасіння Полацкая (1110?—23.05.1173).

805 гадоў таму адбыўся паход полацкага князя Уладзіміра на крыжацкія замкі Ікельсколу і Гольм (1203 г.).

760 гадоў таму Міндоўг абраны Вялікім князем у Наваградку (1248 г.). Утварылася новая дзяржава Вялікае княства Літоўскае. Пачатак вайны Наваградскага княства з Галіцка-Валынскім княствам (1248—1254 гг.).

755 гадоў таму ў Наваградку адбылася каранацыя Міндоўга на караля Літвы (6 ліпеня 1253 г.).

Каля 750 гадоў таму адбыўся паход татара-мангольскага войска Бурундая на Літву (1258 г.).

745 гадоў таму загінуў Міндоўг (1263 г.).

Укняжанне Войшалка ў Наваградку.

730 гадоў таму адбыўся паход татара-маскоўскага войска на Вялікае княства Літоўскае (1278 г.).

710 гадоў таму ўтвораны саюз ВКЛ з Рыгай (1298 г.). Мірная дамова ВКЛ з Лівонскім ордэнам (1.06.1298 г.).

705 гадоў таму адбылося аб'яднанне з ВКЛ Полацкага княства (пачатак XIV ст.).

690 гадоў таму адбыўся шлюб Альгерда Гедзімінавіча з Марыяй, дачкой віцебскага князя Яраслава (1318 г.).

685 гадоў таму Вільня становіцца сталіцай Вялікага княства Літоўскага (1323 г.).

Дружына Давыда Гарадзенскага прыняла ўдзел у абароне Пскова ад лівонскіх і дацкіх рыцараў (1323 г.).

675 гадоў таму адбыўся чарговы паход крыжакоў на Полацк (1333 г.).

670 гадоў таму заключана мірная дамова ВКЛ з Лівонскім ордэнам (1338 г.).

660 гадоў таму адбылася бітва ліцвінскіх войскаў Альгерда і Кейстута з крыжакамі каля ракі Стравы (2.02.1348 г.).

Нарадзіўся Ягайла (у хрышчэнні Якаў) (1348?-1434 гг.), Вялікі князь ВКЛ у 1377—1392 гг.; кароль Польшчы Уладзіслаў II у 1386-1434 гг. Сын Альгерда. Быў саюзнікам Залатой Арды, заключыў пагадненні з Тэўтонскім і Лівонскім ордэнамі і згодна з пагадненнем перадаваў ва ўласнасць апошнім землі Жамойці. У жорсткай барацьбе з Вітаўтам быў вымушаны перадаць яму вялікакняжацкі пасад у ВКЛ і прызнаў Вітаўта пажыццёвым гаспадаром дзяржавы (1392 г.). У саюзе войскі ВКЛ і Польшчы пад агульным камандаваннем Ягайлы здабылі вялікую перамогу над Тэўтонскім ордэнам пад Грунвальдам (1410 г.).

650 гадоў таму адбылося вяртанне ў склад ВКЛ Мсціслава. Прызнанне васальнай залежнасці ад ВКЛ смаленскім князем Святаславам (1358 г.).

640 гадоў таму адбыўся паход Ліцвінскага войска на чале з Альгердам на Маскву (вясна 1368 г.).

635 гадоў таму адбылося абранне Юрыя Карыятавіча гаспадаром зямлі Малдаўскай. Прапанова Папы Рымскага Рыгора XI прыняць каталіцкую веру Альгерду, Кейстуту ды Любарту (1375 г.).

Паход полацкай дружыны на чале з князем Андрэем на Дынабург (1373 г.).

620 гадоў таму вядомыя першыя летапісныя звесткі пра Маладзечна (1388).

615 гадоў таму адбыўся паход крыжакоў на Ліду і Драгічынскую зямлю (зіма 1393 г.).

Вокладка Статута Вялікага княства Літоўскага (1588 г.).

610 гадоў таму адбылося заключэнне ў Горадні мірнага пагаднення паміж ВКЛ і нямецкім Ордэнам (23.04.1398 г.).

Паход Вітаўта ў Дзікія палі. Сімвалічнае прыняцце Чорнага мора пад уладу ВКЛ (лета 1398 г.).

605 гадоў таму адбылося паўторнае ўзяцце Дынабурга войскамі Вялікага князя Вітаўта (1403 г.).

600 гадоў таму адбыўся паход Вітаўта на Маскву. Усталяванне мяжы ВКЛ з Маскоўскім княствам па рацэ Угры (1408 г.).

590 гадоў таму памерла княгіня Ганна. Шлюб Вітаўта з Вульянаю Гальшанскай (1418 г.).

585 гадоў таму адбылося заключэнне міру паміж ВКЛ і Свяшчэннай Рымскай імперыяй (1423 г.).

Адмова Вітаўта ад чэшскай каралеўскай кароны. Абвяшчэнне чэшскім каралём Жыгімонта Карыбутавіча. Дзеянні войскаў ВКЛ у Чэхіі (1423 г.).

580 гадоў таму адбыўся паход Вітаўта на Ноўгарад і аблога Порахава войскамі ВКЛ. Спагнанне выкупу з Ноўгарада (02.07.1428 г.).

575 гадоў таму адбыўся другі паход Свідрыгайлы на Ашмяны дзеля авалодання вялікакняскім пасадам (жнівень 1433 г.).

Першыя летапісныя звесткі пра Талачын (1433 г.).

565 гадоў таму пачалася вайна ВКЛ з Мазовіяй пасля захопу Падляшша каралём Баляславам Мазавецкім (1443 г.).

560 гадоў таму адбылася адмова ліцвінскай дэлегацыі ад заключэння уніі паміж ВКЛ і Польшчаю на Люблінскім Сойме (май 1448 г.).

550 гадоў таму адбылося пацвярджэнне царкоўнай уніі ў ВКЛ мітрапалітам Рыгорам (1458 г.).

545 гадоў таму на Сойме ВКЛ было вылучана патрабаванне да караля Казіміра пра адрачэнне яго ад польскай кароны (снежань 1463 г.).

540 гадоў таму падпісаны Статут Казіміра Ягайлавіча (першы збор законаў Вялікага княства Літоўскага). Зацверджаны Вялікім князем Казімірам з панамі — радай у Вільні (29.02.1468 г.).

515 гадоў таму працягвалася вайна з Масковіяй (1492—1494 гг.).

505 гадоў таму заключана перамір'е ВКЛ з Масковіяй. У выніку да суседняй дзяржавы адышлі Чарнігаўская, Бранская, Гомельская, Ноўгарад-Северская землі (1503 г.).

500 гадоў таму распачалася вайна Масковіі супраць Вялікага княства Літоўскага. Маскоўскі князь Васіль III падтрымаў здраду Міхайлы Глінскага, былога надворнага маршалка ВКЛ, і распачаў агрэсію супраць нашай дзяржавы.

Аблога маскоўскімі войскамі Смаленска (сакавік 1508 г.).

Бітва войскаў ВКЛ з маскоўскімі войскамі каля Дняпра пад Оршай (1508 г.).

495 гадоў таму Ваўкавыск атрымаў Магдэбургскае права (1513 г.).

Пачалася трэцяя аблога Смаленска маскоўскім войскам (1513 г.).

490 гадоў таму Францішак Скарына працягвае выданне ў Празе кніг Святога пісання (1518 г.).

Адбыўся шлюб Вялікага князя Жыгімонта Казіміравіча з Бонай Сфорцай (20.04.1518 г.).

Камянцу было нададзена Магдэбургскае права (1518 г.).

485 гадоў таму ў Кракаве выйшла з друку паэма Міколы Гусоўскага "Песня пра аблічча, дзікасць зубра і паляванне на яго" (кастрычнік 1523 г.).

475 гадоў таму нарадзіўся Стафан Баторый (27.09.1533—12.12.1586) — Кароль Рэчы Паспалітай, Вялікі князь ВКЛ (каранаваны ў чэрвені 1576 г.). Абавязаўся захоўваць самастойнасць ВКЛ, пашыраць яго межы, не прызначаць военачальнікамі ў ВКЛ палякаў. Вызваліў Беларусь і Полацкую зямлю ад маскоўскай акупацыі, Віленскі езуіцкі калегіум пераўтварыў у Акадэмію (1578 г.).

445 гадоў таму маскавіты здабылі Полацк падчас маштабнай агрэсіі Масквы супраць Вялікага княства Літоўскага (15.02.1563 г.).

Выйшла з друку Берасцейская Радзівілаўская Біблія, аздобленая высокамастацкімі ілюстрацыямі, — помнік кніжнай культуры Беларусі (1563 г.).

435 гадоў таму нарадзіўся Язэп Руцкі — пісьменнік, палітык, царкоўна-палітычны, культурны дзеяч, уніяцкі мітрапаліт. Нарадзіўся ў в. Рута Наваградскага павета (1573—05.02.1637). Умацоўваў і пашыраў у ВКЛ уніяцкую царкву і зрабіў яе сапраўды нацыянальным і магутным духоўным інстытутам у нашай краіне. Пахаваны ў Вільні.

430 гадоў таму падпісаны Прывілей Стафана Баторыя пра пераўтварэнне Віленскага езуіцкага калегіума ў Акадэмію (7.07.1578 г.).

420 гадоў таму быў прыняты III Статут ВКЛ. Зацверджаны 28.01.1588 г. Збор законаў усеагульнага права. Помнік юрыдычнай думкі і помнік беларускай літаратурнай мовы эпохі Адраджэння XVI ст. Адзіны ў Еўропе сістэматызаваны збор законаў па ўсіх галінах тагачаснага права. Дзейнічаў у ВКЛ з 1589 г. па 1840 г. У Віцебскай і Магілёўскай губернях — да 1831 г. Адменены акупацыйнымі ўладамі Расійскай імперыі.

390 гадоў таму Жыровічы атрымалі Магдэбургскае права (14.05.1613 г.).

Адбылося заключэнне замірэння паміж Рэччу Паспалітай Двух Народаў і Масковіяй. Вяртанне да Вялікага княства Смаленскай, Чарнігаўскай і Северскай земляў (1.12.1618 г.).

375 гадоў таму быў абраны каралём польскім і Вялікім князем Літоўскім Уладзіслаў III Ваза.

Крычаў атрымаў Магдэбургскае права (1633 г.).

Смаленская вайна паміж Рэччу Паспалітай і Масковіяй.

Асада Смаленска маскоўскім войскам (студзень 1633 г.) закончылася паразай Масковіі, за што маскоўскія баяры Шэін і Ізмайлаў былі пакараныя смерцю (1633 г.).

360 гадоў таму адкрыта ў Оршы брацкая школа (1648 г.).

290 гадоў таму нарадзілася Саламея Рэгіна Русецкая (1718 г. — пасля 1760 г.).

280 гадоў таму нарадзіўся Марцін Пачобут-Адляніцкі (30.09.1728—20.02.1810). Беларускі навуковец-асветнік, астраном, першы дырэктар Віленскай астранамічнай абсерваторыі, прафесар Віленскай акадэміі, у 1780—1803 гг. яе рэктар.

275 гадоў таму нарадзіўся Антоні Тызенгаўз, палітычны і грамадскі дзеяч ВКЛ, асветнік. З 1764 г. канюшы літоўскі, з 1765 г. падскарбі надворны літоўскі, староста гарадзенскі (1733—31.3.1785).

270 гадоў таму нарадзіўся Казімір Нарбут (маёнтак Яшнец Лідскага павета, 1738-1807 гг.). Беларускі асветнік, прадстаўнік эклектычнага накірунку ў філасофіі. Вучыўся ў Шучыне, Вільні, Рыме. Займаўся рэформай школьнага навучання ў ВКЛ, выступаў за развіццё навукі, асветы, культуры ў ВКЛ.

265 гадоў таму пачалося Крычаўскае сялянскае паўстанне (1743 г.).

255 гадоў таму заснавана Віленская абсерваторыя (1753 г.).

250 гадоў таму нарадзіўся Ігнат Язафат Булгак, уніяцкі мітрапаліт, доктар тэалогіі і кананічнага права (Слонімскі павет, 20.04.1758 — 09.03.1838). Вучыўся ў школе пры Жыровіцкім уніяцкім кляштары. Вышэйшую багаслоўскую адукацыю атрымаў у Рыме.

235 гадоў таму пачалася дзейнасць Адукацыйнай народнай камісіі, якая адкрыла ў Беларусі 20 акруговых і падакруговых школ (1773 г.).

Нарадзіўся Юстын Нарбут (Лідскі павет, каля 1773-1845 гг.). Гісторык. Вучыўся ў Віленскім універсітэце. У час паўстання 1794 г. камандаваў палком пяхоты ВКЛ у бітве з царскімі акупантамі пад Соламі (27.08.1794 г.). Атрымаў патэнт на званне палкоўніка Лідскай міліцыі. У апошнія гады даследаваў гісторыю ВКЛ (Беларусі). Пахаваны ў Вільні.

Генерал-фельдмаршал Язэп Рамейка-Гурка ў вызвольнай вайне ў Балгарыі. Мастак Мікола КУПАВА.

220 гадоў таму нарадзіўся Іван Насовіч (2.10.1788—6.8.1877). Мовазнаўца-лексікограф, фалькларыст, этнограф. Выдаў першы слоўнік беларускай мовы (1870 г.).

На Меншчыне ў сям'і вайсковага суддзі ВКЛ нарадзіўся Дамінік Манюшка. Асветнік, вайсковец, ігуменскі падкаморы (06.07.1788—26.09.1848). Пасля заканчэння Віленскага універсітэта атрымаў вучоную ступень доктара права. У спадчынным маёнтку Радкаўшчына Ігуменскага павета заснаваў канвікт (пансіянат для сялянскіх дзяўчынак), у павеце — вучэльню, батанічныя сады. Усё сваё жыццё прысвяціў паляпшэнню становішча сялян. Пахаваны ў Менску ў прадмесці Камароўкі.

215 гадоў таму адбыўся Гарадзенскі сойм, апошні сойм Рэчы Паспалітай (17.06, 13.11.1793 г.), скліканы дзеля зацвярджэння расійска-прускай канвенцыі ад 23.01.1793 г. пра Другі падзел Рэчы Паспалітай Двух Народаў.

Расійская імперыя захапіла Менскае, рэштку Віцебскага і Полацкага ваяводстваў.

210 гадоў таму ў сям'і адваката Мікалая Міцкевіча нарадзіўся Адам Міцкевіч, беларуска-польскі паэт (хутар Завоссе Наваградскага павета, 24.12.1798—26.11.1855). Заснавальнік і яркі прадстаўнік беларускай (літоўскай) школы ў польскамоўнай літаратуры на абшарах ВКЛ, прадстаўнікі якой пісалі на тэмы гісторыі і жыцця беларускага народа, яго фальклору, культуры.

200 гадоў таму нарадзіўся Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч (фальварак Панюшкавічы Бабруйскага павета, 04.02.1808—9.12.1884). Класік беларускай літаратуры. Адзін з пачынальнікаў новага беларускага пісьменства, заснавальнік беларускай драматургіі і тэатра. Скончыў Віленскі і Пецярбургскі універсітэты. Жыў і працаваў у Менску, дзе ў 1852 г. была пастаўлена аперэта "Сялянка" на яго лібрэта і на музыку С.Манюшкі і К.Крыжаноўскага. Ад 1840 г. жыў у фальварку Люцінка.

Нарадзіўся Адам Шэмеш, беларускі жывапісец-партрэтыст, мастацтвазнаўца (Слуцкі павет, 1808-1864 гг.). Мастацкую адукацыю атрымаў у Віленскім універсітэце. Жыў у Менску і ў Вільні. Стварыў партрэты У.Сыракомлі, С.Манюшкі, Е.Фялінскай. Зрабіў праўдзівае апісанне мастацкага жыцця Беларусі першай паловы XIX ст.

У маёнтку Дабраўляны Смаргонскага павета нарадзіўся Казімір Бахматовіч, беларускі мастак-графік (1808-1837 гг.). Скончыў Віленскі універсітэт. Быў прыватным настаўнікам мастацтва графа А.Гюнтэра ў Дабраўлянах. Аўтар літаграфій "Дабраўлянскі сувенір", партрэта Я.Рустэма, "Успамінаў пра Вільню", "Збору нацыянальных і вайсковых строяў".

195 гадоў таму нарадзіўся Паўлюк Багрым (1813?-1891 гг.). Паэт-дэмакрат, каваль.

190 гадоў таму ў маёнтку Ляды Аршанскага павета нарадзіўся Сяргей Заранка (24.09.1818—20.12.1870), вядомы беларускі мастак і педагог. Скончыў Пецярбургскую акадэмію мастацтваў. З 1834 г. акадэмік, прафесар жывапісу.

Нарадзіўся беларускі мастак-карыкатурыст, ілюстратар, паэт-песеннік Артур Бартэльс (1818—23.12.1885).

185 гадоў таму нарадзіўся Уладзіслаў Сыракомля (Людвік Кандратовіч) (фальварак Смольгаў Бабруйскага павета, 29.9.1823—15.9.1862). Паэт-гуманіст, пісьменнік, публіцыст, краязнаўца.

Нарадзіўся ў в.Шыпілавічы Бабруйскага павета Павел Шпілеўскі, беларускі этнограф, пісьменнік, публіцыст, тэатральны крытык (31.10.1823—17.10.1861).

180 гадоў таму нарадзіўся Эмерык Гутэн-Чапскі (1828-1896 г.). Дзяржаўны дзеяч, мецэнат, калекцыянер. У фальварку Станькава заснаваў музей з калекцыямі жывапісу, графікі, малюнкаў, зброі, нумізматыкі, дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, буйной бібліятэкі. Частка калекцыі была перавезена ў Кракаўскі музей імя Чапскага.

Нарадзіўся Язэп Рамэйка-Гурка, генерал-фельдмаршал, удзельнік вызвалення Балгарыі ад турэцкага іга ў 1878 г. (28.7.1828—28.1.1901).

175 гадоў таму нарадзіўся Апалінар Гараўскі (в.Убарні Ігуменскага павета), выдатны беларускі мастак. Прафесар Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Стварыў вялікую калекцыю жывапісных карцін, у якіх апеў Беларусь (1833-1900 гг.).

У маёнтку Адамарын Вілейскага павета нарадзіўся Бенядзікт Дыбоўскі (02.05.1833—31.01.1930). Прыродазнаўца, заолаг і медык. За ўдзел у нацыянальна-вызвольным паўстанні 1863 г. сасланы на 15 гадоў катаргі ў Сібір.

У засценку Мастаўляны Гарадзенскага павета нарадзіўся Віктар Отан Каліноўскі (21.4.1833—6.11.1862). Беларускі археолаг, гісторык, удзельнік нацыянальна-вызвольнага руху ў Беларусі.

170 гадоў таму ў маёнтку Адамарын Вілейскага павета нарадзіўся Уладзіслаў Дыбоўскі (18.04.1838—27.07.1910). Заолаг, батанік, палеантолаг, мінералог, фалькларыст. Доктар мінералагічных навук. За ўдзел у нацыянальна-вызвольным паўстанні 1863 г. асуджаны да турэмнага зняволення.

У засценку Мастаўляны Гарадзенскага павета нарадзіўся Кастусь Вікенці Каліноўскі (2.2.1838—22.3.1864). Нацыянальны герой Беларусі, змагар-дэмакрат, мысляр.

160 гадоў таму нарадзіўся Якуб Наркевіч-Ёдка. (8.1.1848—19.2.1905). Прыродазнаўца, медык. Родам з маёнтка Над-Нёман на Уздзеншчыне. Паходзіў з роду А.Т.Касцюшкі. Ганаровы доктар Віленскага медычнага таварыства. Прафесар электраграфіі і магнетызму.

155 гадоў таму нарадзіўся Міхал Федароўскі (1.9.1853—10.6.1923). Фалькларыст, этнограф, археолаг, калекцыянер. 30 гадоў прысвяціў вывучэнню духоўнай і матэрыяльнай культуры Беларусі. Аўтар 14-томнага выдання "Люд беларускі".

Нарадзілася ў Малых Бакштах Маладзечанскага павета Сафія Кавалеўская, беларуская пісьменніца, фалькларыстка, этнограф (1853—22.02.1918).

150 гадоў таму нарадзіўся Фадзей Дмахоўскі, беларускі мастак, графік, педагог (Піншчына, 1858 г.— ?). Вучыўся ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў і ў Кракаве ў Я.Матэйкі. Стварыў карціны на гістарычныя тэмы і пейзажы. Аўтар малюнкаў гербаў беларускіх гарадоў для "Літоўскага гербоўніка".

145 гадоў таму распачалося Нацыянальна-вызвольнае паўстанне пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага (студзень 1863 г.).

140 гадоў таму нарадзіўся Карусь Каганец (Казімір Кастравіцкі), празаік, паэт, драматург, мастак, грамадскі дзеяч. Паходзіў з Койданаўшчыны са старадаўняга беларускага шляхецкага роду. Нарадзіўся ў Табольску, куды саслалі бацьку з сям'ёй за ўдзел у паўстанні 1863 г. Сваяк французскага паэта Гіёма Апалінэра.

130 гадоў таму нарадзіўся Казімір Малевіч, мастак, адзін з заснавальнікаў абстрактнага мастацтва (1878-1935 гг.).

125 гадоў таму нарадзіўся Францішак Аляхновіч, драматург, пісьменнік і тэатральны дзеяч (1883-1944 гг.).

Заснаваны першы беларускі шклозавод (сучасная назва "Нёман") у Бярозаўцы Лідскага павета (1883 г.).

Нарадзіўся Язэп Лёсік, беларускі грамадскі дзеяч, пісьменнік, мовазнаўца, акадэмік АН Беларусі (1883-1940 гг.).

120 гадоў таму нарадзіўся Язэп Драздовіч, беларускі мастак, этнограф, пісьменнік (1888-1954 гг.).

115 гадоў таму нарадзіўся Максім Гарэцкі, класік беларускай літаратуры, крытык, фалькларыст (1893-1939 гг.). Загінуў у катавальнях НКУС.

Нарадзіўся Андрэй Мрый (А.Шашалевіч), беларускі пісьменнік (1893—1943 гг.). Загінуў у бальшавіцкім канцлагеры.

105 гадоў таму нарадзіўся Сцяпан Бірыла (1903—1978), народны артыст Беларусі.

Нарадзіўся Кастусь Езавітаў, навуковец, літаратар, публіцыст, настаўнік, генерал, дзеяч беларускага нацыянальнага Адраджэння (17.11.1893-1940 гг.). Загінуў у катавальнях НКУС.

Нарадзіўся Вінцэнт Жук-Грышкевіч, гісторык, літаратуразнаўца, педагог, палітычны дзеяч беларускай эміграцыі (1903-1989 гг.). З 1971-га да 1982 г. — старшыня Рады БНР.

Нарадзілася Наталля Арсеннева, беларуская паэтка (20.09.1903—25.7.1997).

100 гадоў таму заснавана ў Вільні кнігавыдавецкае таварыства "Наша хата" (1908—1911 гг.).

95 гадоў таму ўпершыню ў Вільні была пастаўлена п'еса Янкі Купалы "Паўлінка" (1913 г).

Выйшаў з друку ў друкарні Марціна Кухты зборнік паэзіі Максіма Багдановіча "Вянок" (сакавік 1913 г.).

Ад часу выхаду на беларускай мове газеты "Belarus", якая выдавалася лацінкаю ў Вільні (1913—1915 гг.).

Нарадзіўся Віталь Цвірка, народны мастак Беларусі (14.02.1913—11.06.1993).

90 гадоў таму была абвешчана незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі (25.03.1918 г.). 2008 год абвяшчаецца годам Беларускай дзяржаўнасці.

85 гадоў таму нарадзіўся Мікола Крукоўскі (16.11.1923 г.), беларускі філосаф, эстэтык, мовазнаўца, культуролаг, прафесар, доктар філасофіі.

70 гадоў таму ў Беларусі працягваліся рэпрэсіі бальшавіцкіх улад супраць розных пластоў беларускага насельніцтва (1938 г.).

65 гадоў таму ў гады фашысцкай акупацыі была знішчана разам з людзьмі беларуская вёска Хатынь (22.03.1943 г.).

15 гадоў таму адбыўся Першы з'езд беларусаў свету (8—10.07.1993 г.).

СІТУАЦЫЯ

Беларускія памежнікі "не заўважылі" пуцінскіх актывістаў

На 35 сутак арышту асудзіў літоўскі суд дваіх актывістаў прапуцінскага руху "Нашы", якія нелегальна прыйшлі з Беларусі. Расіяне Канстанцін Галаскокаў і Антон Дугін збіраліся такім чынам дайсці да Эстоніі, бо ў атрыманні эстонскіх віз ім было адмоўлена.

Беларускія памежнікі хлопцаў не заўважылі, а ў Літве іх затрымалі. "Нелегалам" пагражала да двух гадоў пазбаўлення волі, перадаюць літоўскія СМІ.

Паслугі

Прыём макулатуры, шклатары і інш. Дапамога інвалідам, пенсіянерам г.Мінска. Тэл.261-11-87, 8-033-661-11-87, 8-044-761-11-87, 8-025-961-11-87.

РЭКАРДСМЕН

Усё жыццё — барацьба

Мінчанін Антон Бондак, які з 1989 года аспрэчвае зваё звальненне, у 150-ы раз звярнуўся па дапамогу да кіраўніка дзяржавы.

У інтэрв'ю БелаПАН А.Бондак паведаміў, што з 1984 года ён працаваў інжынерам па тэхнічным нарміраванні аддзела працы і заработнай платы Мінскага доследнага завода МКТЭІаўтапрам.

"З-за таго што нарміраванне працы рабочых-станкабудаўнікоў праводзілася "на вока", бо адсутнічала неабходная дакументацыя, у сакавіку 1987 года я звярнуўся ў пракуратуру са скаргамі на недахопы ў працы аддзела працы і заработнай платы прадпрыемства. З-за таго, што вынікі агляду ў псіханеўралагічным дыспансеры, якое я прайшоў па накіраванні адміністрацыі завода 27 жніўня 1987 года, не задаволілі кіраўніцтва прадпрыемства, мяне хутка звольнілі "за сістэматычнае невыкананне без уважлівых прычын абавязкаў, ускладзеных працоўным дагаворам". І хаця летам 1988 года суд аднавіў мяне на працы, праз год я быў зноў звольнены ў сувязі "з неадпаведнасцю займаемай пасадзе інжынера па нарміраванні і выніках атэстацыі", — сказаў А.Бондак.

Ён лічыць звальненне незаконным і ўсе наступныя гады спрабаваў аднавіць свае правы, неаднаразова звяртаўся ў саюзныя і рэспубліканскія органы суда і пракуратуры, а таксама да дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі і прэзідэнта краіны.

Паводле слоў А.Бондака, 31 студзеня ён у 150-ы раз пісьмова звярнуўся да кіраўніка дзяржавы, дабіваючыся аб'ектыўнага разгляду сваёй справы і аднаўлення на працы. *"На ўсе мае ранейшыя заказныя лісты на імя Аляксандра Лукашэнкі з паведамленнем аб уручэнні я атрымаў з Адміністрацыі прэзідэнта некалькі адказаў у выглядзе фармальных адпісак. Мне ўжо 72 года, аднак у знак пратэсту супраць незаконнага звальнення я адмовіўся ад налічэння і атрымання пенсіі, хаця мой працоўны стаж складае 30 гадоў"*, — падкрэсліў Антон Бондак, паведаміўшы, што жыве з сястрой на яе невялікую пенсію.

"Мяне, нармальнага чалавека, двойчы насільна накіроўвалі на стацыянарную судова-псіхіятрычную экспертызу. Такое стаўленне характэрнае для нашага грамадства, дзе хочуць прадставіць ненармальным чалавека, які імкнецца жыць па законах і сумленна", — сказаў А.Бондак.

Марат ГАРАВЫ.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 5.02.2008 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №